Можна купляць у беларускіх кнігарнях: Ме́нск, Захараўская № 18 і Вільня, Завальная № 7.

БЕЛАРУСКАЯ ГРАМАТЫКА
ДЛЯ ШКОЛ

Напісаў кандыдат філёлёгіі Петрагр. Унівэр.

Б. Тарашке́віч.

Выданьне «Беларускага Камітэту».

Zur Verbreitung im Gebiet des Militär-Gouvernements Litauen und zur Ausfuhr zugelassen. Presseabteilung des Militär-Gouvernements Litauen.

ВІЛЬНЯ.
Друкарня М. Кухты.
1918 г.

Ад аўтара.

Дагэтуль беларуская літэратурная мова разьвівалася толькі паводлуг сваіх найагульнейшых правоў, найбольш для яе характэрных і ад каторых яна не адступала. Шмат якія пытаньні заставаліся без адказу. Ня было аднолькавага правапісу. Нічога дзіўнога. Пакінуўшы даўно парваныя і занятаўшыя традыцыі старасьвецкае беларушчыны, мова новага пісьменства адразу пачала буйна ўзрастаць з народнага карэньня. А народнае карэньне—яно вельмі багатае. І ня глёдзячы на вялікую суцэльнасьць усяе беларускае мовы, яна мае, як і кожная іншая мова, колькі асобных, выразьней азначаных гутарак. Кожная гутарка дабівалася, каб заняць пачэснае мейсца ў нашым пісьменстве. Дзеля гэтага—і розныя, часта паміж сабой нязгодныя, спосабы пісаньня.

Трэба было часу, каб само жыцьцё паказала, якая гутарка мае найбольш сілы і здатнасьці на тое, каб зробіцца *асновай* літэратурнае мовы.

Трэба было часу, каб праявіліся ў пісьменстве ўсе, якія толькі ёсьць у асобных гутарках, чыста беларускія асобнасьці.

Бяз гэтага не магло быць ніякае хоць больш менш закончанае граматыкі, не магло быць і сталага, яснага правапісу. Бо граматыка павінна толькі замацаваць і падраўняць тыя лініі, якія сама мова ўжо назначыла.

Мне здаецца, што гэтыя лініі і характэрныя асобнасьці ўжо азначыліся, дзеля чаго я і адважыўся выпусьціць у сьвет „Беларускую граматыку“.

У аснове яе ляжыць найбольш характэрная і найбольш чыстая гутарка беларускае мовы, што мае цьвёрдае *р* і вялікае аканьне.

Але аканьне агранічана некаторымі разамі, да чаго прымушае нас доўгая практыка нашага пісьменства.

Прымаюцца і ўсé другія характэрныя асобнасьці беларускае мовы, якія праводзіліся дагэтуль у нашых выданьнях.

Ад прынятае традыцыі адхіляюся толькі тады, калі гэтага вымагае яснасьць сыстэмы або чыстасьць мовы.

Зусім новага нічога ня ўводжу.

Аднолька-ж ня цумаю—што жыцьцё ня зробіць з часам значных зьмéнаў. Будзем толькі мéць надзéю, што не заліш на вялікія і што ўсё найважнéйшае зроблена добра.

Патрэбы школы прымусілі мяне адкінуць усё тое, што мéла больш чыста навуковае значэньне, як практычнае. Я ўвéсь час не выпускаў з вачэй *пэдагогічную старану* кніжкі.

Маю надзéю, што ў будучыне лéпшы час пазволіць мнé выпусьціць паўнéйшую і больш навуковую граматыку беларускае мовы.

Канчаючы, дзякую ўсім, хто мнé служыў радаю і крытыкай.

А найбольш майму добраму вучыцелю, **акадэміку А. А. Шахматову,** каторы за ўвéсь час маіх унівэрсытэцкіх навук і пасьля паддаваў мнé ахвоты напісаць беларускую граматыку і няспынна кіраваў маёю працаю.

Прыязнаму земляку **акадэміку Е. Карскаму** шчыры і вялікі дзякуй за яго ўвагу і значную помач (ён праглéдзіў маю працу і даў вялікшую частку беларускай граматычнай тэрмінолёгіі).

Не магу ня ўспомніць і **докт. Рудольфа Абіхта,** прафэсара славянскіх моваў у Брэслаўскім Унівэрсытэце, бо яго думкі аб беларускай мове, пісьмы, пісаныя пабеларуску да маіх прыяцеляў у Вільні, і кніжка «Просты спосаб стацца ў кароткім часе граматным», пераканалі мянé ў тым, што я стаю на правільнай дарозе.

Б. Тарашкéвіч.

Вільня

13 жніўня 1918 г.

I.

ГУКІ.

§ 1. Слова, склад націск. Слова дзéліцца на **склады**: ва-да, ха-та, до-ля, ся-кé-ра, ра-ні-ца. Слова можа быць *аднаскладовым,* калі ў ім адзін склад (дом, стол, конь), *двухскладовым* (вада, зяр-нё) і *шматскладовым* (пе-ра-ро-біц-ца).

Калі на пісьмé слова не зьмяшчаецца ў адным радку, то яго можна перанясьці ў другі радок, але толькі так, каб не парваць складоў (вы-це-ра-біць). Канцы радка трэба паставіць знак пераносу (-).

У кожным слове адзін склад выгаварваецца галасьнéй за другія, з **націскам**: хá-та, ка-рá, кáра.

Нáціск, калі трэба, азначаецца знакам ʹ над літарай.

Задачка. Разьбіць словы на склады малéнькімі рыскамі і азначыць націск (вось так, напрыклад: ва-дá, да-рó-га):

Пажар, сьцяна, туман, агонь, загон, калека, пранік, Марыля, баравік, павучок, месяц, журавель, ялавец. Бог больш мае як раздаў. Скупы два разы траціць. Усякі цыган сваíго каня хваліць.

§ 2. Гукі галосныя і зычныя. Склады можна разлажыць на асобныя **гукі**. Слова „соль“ можам

сказаць так, каб кожны гук у ім цягнуўся доўга: с-о-ль. Лёгка пачуць, што ў гэтым слове тры гукі. У слове „рыба“ чатыры гукі, у слове „горка“ пяць гукаў і г. д.

Гукі дзе́ляцца на **галосныя** і **зычныя**.

Галосныя гукі: а, о, у, э (е), ы, і. Зычныя гукі: б, в, г, ґ, д, дз, дж, ж, з, к, л, м, н, п, р, с, т, ф, х, ц, ч. Пры вымове галосных гукаў чуваць голас, грудзі дрыжаць. Іх можна доўга цягнуць, пяяць. Пры вымове зычных гукаў чуваць зык, а ня голас.

У складзе павінен быць адзін галосны гук — колькі галосных гукаў у слове, толькі ў ім складоў: стра-ха, пра-ле́с-ка. Склад можа быць і з аднаго толькі галоснага гуку: а-бы, а-ле́.

Зычных у складзе можа быць колькі і можа ня быць ніводнага: страш-ны, а-ле́.

Зычныя ўжываюцца толькі разам з галоснымі*).

Галосныя ў і *й* ня твораць асобнага складу: даў, праўда, дай, яд (значыць йад), вайна. З гэтага яны падобныя да зычных. (Гукі ў і *й* часамі называюць **паўгалоснымі**).

На пачатку слова дзеля вялікшае складнасьці *у, і* замяняюцца на кароткае ў, *й*, калі яны стаяць пасьля галоснага гуку: мы ўжо зробілі; я йду да цябе́.

Задачка. Перапішы, замяніўшы крыжык якімі трэба літарамі:

Гартаі загаралі ×сё поле. Яны ×вайшлі × хату. Было × бацькі тры сыны. Бацька × маці ×жо вярнуліся з поля. Была адна кароўка ды× тую ваўкі зьелі. А хто там ×дзе́? Хто ×дзе́, той паклоніцца.

---

*) Дзеля гэтага зычныя гукі называюць яшчэ сугалоснымі. Гэты назоў ня добры тым, што можна было-б падумаць, быццам зычныя гукі вымаўляюцца з голасам.

§ 3. Цьвёрдыя і мягкія зычныя. Зычныя гукі могуць вымаўляцца цьвёрда і мягка.

Цьвёрдыя зычныя (*б, в, г, ґ, д, дз, дж, ж, з, к, л, м, н, п, р, с, т, ф, х, ц, ч, ш*) чуваць, напрыклад, у такіх словах: *б*осы, *в*ол, *г*осьць, *д*оля, ксян*дз*ы, *ж*ыта, ура*дж*ай, *з*орка, *к*ол, *л*ом, *н*ыркі, *п*ышны, *р*ысь, *с*ын, *т*ын, *ф*ыркаць, *х*ата, *ц*эп, *ч*ысты, *ш*ырокі.

Гэтыя самыя зычныя чуваць мягка ў такіх разох, як *б*іць, *в*іць, *г*інуць, *дз*ік, *з*іма, *к*інуць, *л*ёгкі, *м*е́йсца, *Н*ёман, *п*яць, *с*е́м, *ф*ігура, *х*ітры, *ц*іха.

Зычныя р, ж, ч, ш, заўсёды цьвёрдыя: рэпа, зара, жоўты, чысты, шырокі.

Так сама няма мягкіх *д* і *т*, бо яны зьмяніліся на мягкае *дз* і *ц*: *дзе́*нь, *ц*е́нь, *дз*ік, *ц*іха, *дз*я*дз*ька, пі*ц*ь (**дзе́каньне і це́каньне**).

Задачка. Літары, што азначаюць цьвёрдыя зычныя, падчыркнуць аднэй рыскай, а тыя, што азначаюць мягкія — дзьвюма:

Люлі, люлі, люлі!
Прыляце́лі куры,
Се́лі на вароцех
У чырвоных боцех,
Сталі сакатаці.
Што курачкам даці:
Ці жыта карыта,
Ці ячме́ню жме́ню,
Ці бобу каробу.

Звонкія і глухія зычныя.

§ 4. Зычныя могуць вымаўляцца *звонка* (з голасам) і *глуха* (бяз голасу), прычым

звонкаму адказвае глухі

б	**п**	(бабы—папы)
д	**т**	(дам—там)
ґ	**к**	(ґіль—кінь)
г	**х**	(гам—хам)
з	**с**	(заву—саву)
ж	**ш**	(жаль—шаль)
дз	**ц**	(дзéнь—цéнь)
дж	**ч**	(хаджу—хачу)

р, **л**, **м**, **н** } ня маюць падобных глухіх.

Задачка. Аднэй рыскаю адзначыць звонкія **гукі**, дзьвюма глухія.

Вясковыя дзéці.

Пусты ўлéтку нашы сёлы,
Усé на полі за сярпом,
Толькі дзéтак крык вясёлы
Льéцца ў вуліцах руччом.

Вéцер кудры іх цалуе,
Мые дождж іх блéдны твар,
З імі сонейка жартуе
І цяпло ім шлé, як дар.

Якуб Колас.

§ 5. Зычныя **з**, **с**, **ц**, **дз** называюцца **сычачымі**.
" **ж**, **дж**, **ш**, **ч** " **шыпячымі**.
" **р**, **л** " **плаўнымі**.
" **н**, **м** " **насавымі**

§ 6. Водлуг тых прыладаў, якімі найбольш вымаўляюцца зычныя, іх можна падзяліць на

губныя: б, в, м, п, ф.
язычныя: д, ж, дж, ч, ш, з, с, ц, дз, **р**, л, н.
гартанныя: г, ґ, к, х.

Задачка. У кожным слове апішы ўсé зычныя гукі—якія яны: 1) цьвёрдыя ці мягкія; 2) звонкія ці глухія; 3) сычачыя, шыпячыя ці насавыя; 4) губныя, язычныя, гартанныя:

Хто поле троіць, той хлéб кроіць. Калі ўлéз у дугу, не кажы не магу. Калі мужык з жонкай сварыцца, тады ў гаршку трасца варыцца.

(Пішы ў гэткім парадку: 1) хто; *х* — цьвёрды, глухі, гартанны; *т*—цьвёрды, глухі, язычны і г. д.).

§ 7. На пісьмé гукі азначаюцца літарамі (буквамі). Усé літары мовы, пералічаныя ў сталым парадку, называюцца азбукай (абэцэда).

Вось беларуская азбука: а, б, в, г, ґ, д, е, ё, ж, з, і, й, к, л, м, н, о, п, р, с, т, у, ў, ф, х, ц, ч, ш, ы, ь, э, ю, я.

Побач з кірыліцай ужываюць яшчэ *лацініку*:
a, b, c, ć, č, d, f, g, h, i, j, k, l, ł, m, n, ń, o, p, r, s, ś, š, t, u, ŭ, w, y, z, ź, ž.

Літары **я**, **е**, **ё**, **ю** не азначаюць якіх асобных гукаў, розных ад **а**, **э**, **о**, **у**. Калі я, е, ё, ці ю стаіць за зычным, то зычны вымаўляецца мягка: сяду, нéба, лён, людзі, (значыць—сьяду, ньэба, льон, льудзі). На пачатку складу я, е, ё, ю значыць тое, што йа, йэ, йо, йу: яма—йама, твая—твайа; ёлка—йолка, патаёмны—патайомны; юшка—йушка; граюць — грайуць.

Знак **ь** не азначае ніякага гуку, а толькі мягкасьць зычнага: вугаль (але вугал), колькі (але калы), сьцяна, дзядзька і г. д.

Часамі **ь** паказвае, што зычны ня трэба зьліваць з чародным галосным, бо паміж імі чуваць й: зьявіцца, зьéсьці і г. д. (вымаўляецца: зьйавіцца, зьйэсьці).

Пасьля цьвёрдага зычнага ставіцца ў такім разе знак ’ над радком паміж літарамі: аб’явіць аб’е́хаць, аб’е́сьці, пад’е́ду і г. д.

Для азначэньня зыкаў **дж** і **дз** пішацца па дзьве́ літары, але трэба памятаць, што вымаўляюцца яны не паасобку, а разам: ся*дж*у, ся*дз*е́ць.

Для азначэньня такога зыку, як у словах мазґі, ґанак ужываецца знак ґ*).

§ 8. Дзеля таго, што ў беларускай мове зычныя **ж**, **ч**, **ш**, **р** цьвёрдыя, то пасьля іх ужываецца ня *і*, а заўсёды *ы*: ж*ы*ла, ч*ы*ста, ш*ы*ла, бяр*ы*.

Дзеля таго самага пасьля ж, ч, ш, р. ніколі ня пішацца *я*, *ю*, *е*, ё, а толькі *а*, *у*, *э*, *о*: бур*а*, гавар*у*, р*э*заць, сьцяр*о*г,; ж*а*ба, ж*у*к, ж*э*ўжык, ж*о*ўты; ч*а*сьць, ч*у*ю, ч*э*сьць, ч*о*рны; ш*а*бля, ш*у*м, ш*э*ршань, ш*о*сты.

Задачка. Паставіць літары заме́ста крыжыка:

Р×ба, гр×б, гр×зь, р×бы, зьбяр×г, твар×г, ж×ць, ж×рдзь, ж×нка, ч×ста, зач×пка ч×рт, быч×к; шэрш×нь, ш×ць, страш×нны, ш×сьнік. ш×ры, ш×ўк, ш×м.

§ 9 Аканьне. Гукі **о** (ё), **э** (е) ў беларускай мове чуваць ясна толькі пад націскам: до́бра, цёплы, ле́с, цэлы і г. д.

Калі склад не пад націскам, то заме́ста *о*, *э* чуваць *а*: добры -- дабро́; цёплы — цяпло́, (цьапло), ле́с—лясы (льасы), цэп—цапы.

Аканьне найвыразьне́й выступае ў складзе перад самым націскам: ле́с—лясы. У другіх складах на ме́йсцы *э* можа быць гук блізкі да *і* або гук няясны паміж *а* і *е*—$а^{е}$: лесавік вымаўляецца лісавік або ля^{е}савік.

---

*) Не заўсёды.

Аб тым, як трэба пісаць пры аканьні, глядзі „Пра́вапіс“.

§ 10. Аб складох ры, лы, лі. У складох не пад націскам знаходзім **ры**, **лы**, **лі** ў гэткіх словах: дрыжэць, глытаць, праглынуць, трысьцінка, трысьнік, брыво, крыві, крываві, блыха́, блыхі, дрывамі, дрывяны, крышыць, крыха, грыме́ць, трыбух, хрысьціць, трывога, скрыгатаць, брысьці, яблык, яблына, блішчэць.

Калі на гэтыя склады прыходзіцца націск, то тады знаходзім **ро**, **ло**: дрож, тросьць, бровы, кроў, блохі, дровы, крошка, гром, хрост, брод і г. д.

Задачка. Перапішы вышэй пералічаныя словы ў другіх формах (напр.: дрыжу, дрыжэў, брыво, брыва, брыву, і г. д., але бровы).

§ 11. Падвойныя зычныя. Беларуская мова мае падвойныя зычныя ў такіх разох:

льль: вясе́льле, купальле, гальлё, Ільля, ральля, сольлю, кольле і г. д.

ньнь: здарэньне, сумле́ньне, пытаньне і г. д.

зьзь: з гразьзю, мазьзю, зазьзяць і г. д.

сьсь: каса—касьсё, волас—валосьсе, колас—калосьсе і г. д.

дзьдзь: судзьдзя.

цьць: жыцьцё, багацьце, куцьця і г. д.

жж: збожжа і г. д.

чч: лык—лычча, сук — суччо, пе́ч — запе́чча, за пе́ччу, у ваччу і г. д.

шш: зацішша, каля ушшу, з роскашшу і інш.

Апрача гэтага падвойныя зычныя зьяўляюцца пры тым, як словы складаюцца: с-сыпаць, ад-даць, бяз-зубы і г. д.

Задачка. Перапішы словы з удваеньнем і дапішы свае́ прыклады.

§ 12. Прыдыханьне. Калі слова пачынаецца з галоснага, то перад ім можа стаяць *прыдыханьне* **в** або **г**: *в*ока, *в*уха; аве́с—гаве́с і г. д. Прыдыханьне сустракаецца і ў сярэдзіне слова паміж двума галоснымі: павук, навука, цівун і інш.

Задачка. Азнач рыскаю прыдыханьне:

Вакно, варыць, вочы, вол, вужака, вузкі, вугаль, павук, павёў, віна, вайна, Радзівон, вон, Лявон, аплявуха, гараць, гара, гарэх, грэх, гарбуз, ганю, гаруц, вуліца, густы, горад, гарод, гоні.

§ 13 Кароткае ў. Паміж галосным і зычным можаць стаяць толькі ў, а не *в:* залатоўка, кароўка, (але—карова), толькі рэха ў ле́се йдзе́.

У канцы закрытага складу*) стаіць так сама ня л, а ў: даў, поўны, тоўсты і інш.**).

Задачка. Паставіць літара заме́ста крыжыка:

Апусьце́×а поле. Работы на ім да×но скончаны. Пуста і гола ×сюды, толькі ма×адое жыта адно зеляне́е × полі і рэзка выдзяляецца сярод мёртвага абразу асе́ньняга часу. Пачарне́× шырокі ×уг; адны толькі парыжэ×шыя фігуры стаго× з востраю жэрдкаю × ве́рсе раскінуліся па грудо× і нудна пазіраюць × не́ба.

14. Звонкія зычныя перад глухімі і на канцы слова страцілі звонкасьць і вымаўляюцца глуха:

---

*) Закрыты склад гэта такі, што канчаецца на **зычныя** або на ў, й: пол, вол, пан, **дай**, **ме́ў** і г. д. У слове **ва-да**, абодва склацы адкрытыя.

**) Але ў іме́ньнях астаецца: кол, стол, гарэлка, іголка і інш.

пішацца:	вымаўляецца:
рэ*д*ка	рэ*т*ка
но*ж*ка	но*ш*ка
гра*з*ка	гра*с*ка
а*б*хапіць	а*п*хапіць
бо*б*	бо*п*
лё*д*	лё*т*
до*ждж*	до*шч*

і г. д.

Глухія зычныя перад звонкімі зробіліся звонкімі:

пішацца:	вымаўляецца:
ка*с*ьба	ка*з*ьба
мала*ц*ьба	мала*дз*ьба

і г. д.

Задачка. Крыжыкі замяніць літарамі:

Асе́ньні ве́чар.

Вые бура. Ле́+ гамоніць,
Як на сходзе гдзе́ наро+.
Ве́цер хмары так і гоніць;
До++ і гра+ь і галалё+.
На камінку корч пылае;
Каля пе́чы дзе́+ сядзіць,
Ба+ька ла+ці папраўляе,
Маці ні+кі се́ла ві+ь.
Ве́цер вые, ня сьціхае,
Дзіка ў коміне шумі+,—
То заплача, засьпявае
То па стрэсе прабяжыць.
Ціха ў хаце. Сэрца ные,
Душу стра+ апанаваў.
Чаму-+, ве́цер, думкі злыя
У душу ты маю нагнаў?

Якуб Колас.

II.

Часьціны мовы.

§ 15. Усé словы можна падзяліць на 9 радоў або *дзéвяць часьцінаў мовы:*

1.	**імя**	5.	**дзеяслоў**
2.	**прымéта**	6.	**прыслоўе**
3.	**чысло**	7.	**прыймя**
4.	**займя**	8.	**злуч**
		9.	**кліч.**

§ 16. Імя. Да гэтае часьціны мовы належáць усé тыя словы, што *скланяюцца* і маюць адзін з трох радоў: *мужчынскі* (баран, стол), *жаноцкі* (авéчка, лава), *ніякі* (вакно дабро).

§ 17. Скланéньнем называецца зьмéна канчатку слоў у *адзіночным* і *множным ліку* ў залéжнасьці ад розных пытаньняў, напрыклад:

пытаньне	лік адзіночны	лік множны
1. хто?	брат	браты
што?	стол	сталы
2. каго?	брата	братоў
чаго?	стала	сталоў

пытаньне	лік адзіночны	лік множны
3. каму?	брату	братом
чаму?	сталу	сталом
4. каго?	брата	братоў
што?	стол	сталы
5. кім?	братам	братамі
чым?	сталом	сталамі
6. пры кім?	браце	братох
пры чым?	сталé	сталох
7. Завучы кажам:	браце!	браты!
	сталé!	сталы!

Гэтыя пытаньні называюцца *склонамі.* Кожны склон мае свой уласны назоў:

1.	*назоўны*	хто? што?
2.	*родны*	каго? чаго?
3.	*давальны*	каму? чаму?
4.	*вінавальны*	каго? што?
5.	*творны*	кім? чым?
6.	*мéсны*	пры кім? пры чым?
7.	*клічны*	ужываецца пры клíканьні.

Задачка. Праскланяй у адзіночным і множным ліку: дом, вада, палатно.

§ 18. Апрача ліку адзіночнага і множнага ў беларускай мове часамі бывае *парны лік:* дзьвé назé, дзьвé руцэ, дзьвé сасé і г. д*).

Ад множнага ліку трэба адрозьніць такія *зборныя* імéньні, як гальлё, лісьцё, кольле і інш., якія маюць форму адзіночнага ліку, але азначаюць збор многіх аднолькавых рэчаў.

---

*) але заўсёды: два сталы, два браты і г. д., а ня два братá, два сталá (водлуг старога парнага ліку).

§ 19. Некаторыя іме́ньні **ўжываюцца толькі** ў *адзіночным ліку:* жывёла, гародніна, садовіна, малако, насе́ньне, хараство і шмат іншых.

Некаторыя—**толькі** ў *множным ліку:* сані, се́ні, дрыжыкі і шмат інш.

Задачка. Напішы, якія іме́ньні ве́даеш, што ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку або толькі ў множным ліку.

§ 20. Кожнае імя нале́жыць да аднаго з трох *радоў: мужчынскага, жаноцкага або ніякага.* Калі на якую рэч можна казаць **ён**, то гэта мужч. р.: брат, стол і г. д.; калі можна казаць — **яна**, то гэта жаноцкі род: сястра, бяда, кніга і г. д.; калі—**яно**, то гэта ніякі род: дзіця, вакно, дабро і г. д.

Некаторыя іме́ньні нале́жаць да *агульнага* роду калі могуць азначаць так сама мужчынскі як і жаноцкі род: сірата, кале́ка і інш.

Задачка. Напішы прыклады на іме́ньні мужчынскага, жаноцкага, ніякага і агульнага роду.

§ 21. Імя можа быць або *ўласным:* Вільня, Ме́нск, Беларусь, Лявон—або *агульным:* ме́ста, край, чалаве́к і г. д.

Уласнае імя азначае толькі адну якую рэч, каб аддзяліць яе́ ад другіх падобных.

Агульнае імя паказавае наагул цэлы рад падобных рэчаў.

Уласнае імя пішацца з вялікае літары.

Узоры склане́ньня.

I. Мужчынскі род.

§ 22. А. Цьвёрды зычны перад канчаткам:

	лік адзіночны.	лік множны.
а) Наз.	1) вол	вал-ы
Род.	вал-а́	вал-оў
Дав.	вал-у	вал-ом
Він.	вал-а	вал-ы
Твор.	вал-ом	вал-амі
Ме́сн.	вал-е́	вал-ох
Кліч.	бач ніжэй § 26.	

Другія прыклады:

лік адзіночны.

Наз.	2) пясок	3) дождж
Род.	пяск-у	дажджж-у
Дав.	пяск-у	дажджж-у
Він.	як Назоўны	
Твор.	пяско-м	дажджж-ом
Ме́сн.	пяск-у	дажджж-у

лік множны.

Наз.	пяск-і	дажджж-ы
Родн.	пяск-оў	дажджж-оў
Дав.	пяск-ом	дажджж-ом
Він.	як Назоўны	
Твор.	пяск-амі	дажджж-амі
Ме́с.	пяск-о́х	дажджж-о́х

лік адзіночны.

Наз.	4) кане́ц	5) хвальк-о́
Родн.	канц-а́	хвальк-а́

Дав.	канц-у	хвальк-у
Він.	як Наз.	як Родн.
Тв.	канц-ом	хвальк-ом
Мéс.	канц-ы	хвальк-у

лік множны.

Наз.	канц-ы	хваль-кі
Род.	канц-óў	хвальк-оў
Дав.	канц-óм	хвальк-óм
Він.	як Наз.	як Родн.
Тв.	канц-áмі	хвальк-áмі
Мéс.	канц-óх	хвальк-óх

У ва ўсіх гэтых прыкладах націск прыходзіцца на самы канчатак слова: вал-á, вал-у, вал-óм, вал-é, вал-ы, вал-óў і г. д.

б) Калі націск ня прыходзіцца на самы канчатак, то замéста *о* стаіць *а* (аканьне). У мéсным склоне *е* астаéцца.

лік адзіночны.

Наз.	1) брат	2) народ	3) страх
Род.	брат-а	народ-у	страх-у
Дав.	брат-у	народ-у	страх-у
Він.	як Род.	як Назоўны	
Тв.	брат-ам	народ-ам	страх-ам
Мéс.	брац-е	народз-е	страс-е і страх-у

лік множны.

Наз.	брат-ы	народ-ы	стрáх-і
Род.	брат-оў	народ-аў	страх-аў
Дав.	брат-ом	народ-ам	страх-ам
Він.	як Род.	я к Н а з о ў н ы	
Тв.	брат-амі	народ-амі	страх-амі
Мéс.	брат-ох	народ-ах	страх-ах

§ 23. Мягкі зычны перад канчаткам.

адзіночны лік.

Наз.	1) лось	2) локаць	3) конь
Род.	лас-я	лóкц-я	кан-я
Дав.	лас-ю	лóкц-ю	кан-ю
Він.	як Род.	як Наз.	як Род.
Тв.	лас-ём	лóкц-ем	кан-ём
Мéс.	лас-і	лóкц-і	кан-і

лік множны.

Наз.	лас-і	локц-і	кон-і
Род.	лас-ёў	локц-яў	кон-яў
Дав.	лас-ём	локц-ям	кон-ям
Він.	я к Н а з о ў н ы		
Тв.	лас-ямі	локц-ямі	кон-ямі
Мéс.	лас-ёх	локц-ях	кон-ях

§ 24. С. **Імéньні на-й** скланяюцца так сама:

лік адзіночны.

Наз.	верабéй	лой	абычай
Род.	вераб-я	ло-ю	абычá-ю
Дав.	вераб-ю	ло-ю	абычá-ю
Він.	як Род.	як Назоўны	
Тв.	вераб-ём	ло-ем	абычá-ем
Мéс.	вераб-і	ло-і	абычá-і

лік множны.

Наз.	вераб'-і	абычá-і
Род.	вераб'-ёў	абыча-яў
Дав.	вераб'-ём	абычá-ям
Він.	як Назоўны	
Тв.	вераб'-ямі	абыча-ямі
Мéс.	вераб'-ёх	абыча-ях

§ 25. Увагі аб розных канчатках.

1. *Родны склон адз. ліку* мае канчатак *у* або *а*, як у цьвёрдым, так і ў мягкім складненьні (у мягкім пішацца—ю, я).

Канчатак — *а* знаходзім:

1) у уме́ньнях, што азначаюць жывыя творы: чалаве́ка, Язэпа, брата, ваўка, вала, злодзея, вераб'я і інш.

2) у іме́ньнях прадмѐтных*), што можна бачыць, лічыць, найбольш, калі націск прыходзіцца на канчатак: грош—граша́, куст—куста́, малаток—малатка, нож—нажа́, нос—наса́, кош—каша̀, коўш—каўша́, гарнец—гарца і інш.

3) у назовах ме́сяцаў: студня, марца, красавіка, мая і г. д.

Усе́ іншыя іме́ньні звычайна маюць канчатак *у*: розуму, болю, жалю, сьме́ху, смутку, грому, роду, міру, абычаю, дару, страху, ве́ку, року, пакою, усходу, заходу, це́ню, (гэты це́нь), плачу, ураджаю, сну, жару, прымусу, люду, народу, краю, бору, ле́су, сьне́гу, лёду, попелу, але́ю, шроту, хвойніку і шмат інш.

Бачым, што ва ўсіх гэтых іме́ньнях націск ня прыходзіцца на *у*. Толькі ў гэткіх сло́вах, як *пясок, тытун, галун, палын, авёс,* знаходзім: пяску, тытуну, галуну, палыну, аўсу.

Апрача гэтага—*у* пад націскам знаходзім яшчэ ў колькі словах: дажджу, агню і часамі чацьвяргу.

2. *Ме́сны склон адз. ліку* мае чатыры канчаткі: *е, і, ы, у.*

У іме́ньнях *з цьвёрдым зычным перад канчаткам* знаходзім *е:* на дубе́, пры стале́, у млыне́, у кажусе́, граць на разе́, у гаросе (канчатак не пад націскам).

Іме́ньні на *ж, ш, ч, ц, р* заўсёды маюць *ы:* на дажджы, у кашы, на нажы, у калодзяжы, аб коклюшы, паралюшы, у плачы, у бучы, на канцы, на пальцы, на жарабцы, у бары, на тапары і г. д.

З іме́ньняў на *ж, ш, ч, ц, р* тыя, што азначаюць асобы, найчасьце́й маюць *у:* аб купцу, пры Рыгору, Лукашу, аб Марцінке́вічу, аб чужазе́мцу, не́мцу, кітайцу і г. д.

Іме́ньні на — *к* блізка заўсёды маюць канчатак на *у:* у Полацку, на баку, аб ваўку, на языку, аб чалаве́ку.

---

*) ад слова прадмет (рэч): усе тыя іменьні, што можам бачыць лічыць, называюцца прадметнымі.

Іме́ньні *з мягкім зычным перад канчаткам* канчаюцца на *і:* пры гасьці, цясьці, камяні, кані, салаўі, вераб'і, Дунаі, прыяцелі і г. д.

3. *Клічны склон.* У значэньні клічнага склону часта ўжываецца назоўны склон: паслухай, братка! паслухайце, браткі! Але клічны склон мае і свае́ асобныя канчаткі—*у* і *е* (пасьля цьвёрдага зычнага *а*):

1) Іване, слаўны пане! попе, браце, сваце, дубе, ле́се, сусе́дзе і г. д.

Бог—Божа, чалаве́к — чалаве́ча, казак—казача, воўк—воўча, гарох—гаросе, гарэх—гарэсе, айце́ц—ойча, купе́ц—купча і інш.

2) Конь—коню, вучыцель—вучыцелю, госьць,—госьцю, рай—раю, дабрадзею і г. д.; мужу, крыжу, панічу, пісару, бору, явару, братку, галубочку, дзядзьку, дзе́дку, сынку і г. д.

У множным ліку часамі ўжываецца канчатак —*ове:* панове! сватове! жыдове! і г. д.

Задачка. 1) Праскланяй: чалаве́к, вол, воз, гарод, двор, залом, пісар, раме́нь, зьвѐр, аўторак, це́нь, боль, авёс, верабе́й, сук, гарэх, вораг, бе́раг, але́нь, нож.

2) Напішы, якія ве́даеш словы на *а* і на *у* ў родным склоне, апрача тых, што ёсьць у граматыцы.

3) Адкажы, у якім склоне зроблены вынятак з-пад аканьня.

4) Успомні з пе́сьняў, казкаў ці прыказкаў якія-колечы іме́ньні ў клічным склоне.

II. Ніякі род.

§ 26. Іме́ньні на о (не пад націскам—а).

Склане́ньне слоў на *о* падобнае да мужчынскага роду.

Тры склоны — назоўны, вінавальны і клічны заўсёды аднолькавы (дзеля гэтага пішам іх у адным радку: Н. В. К.).

Прыклады.

Адзіночны лік.

Н. В. К.	1) сял-о	2) пале́н-а
Род.	сял-а	пале́н-а
Дав.	сял-у	пале́н-у
Тв.	сял-ом	пале́н-ам
Ме́с.	сял-е́	пале́н-е

Множны лік.

Н. В. К.	сёл-ы	пале́н-ы
Род.	сёл-аў	пале́н-аў
Дав.	сёл-ам	пале́н-ам
Тв.	сёл-амі	пале́н-амі
Ме́с.	сёл-ах	пале́н-ах

Адзіночны лік.

Н. В. К.	3) пляч-о	4) мор-а
Род.	пляч-а	мор-а
Дав.	пляч-у	мор-у
Тв.	пляч-ом	мор-ам
Ме́с.	пляч-ы	мор-ы

Множны лік.

Н. В. К.	пле́-чы	мор-ы
Род.	пле́ч-аў	мор-аў
Дав.	пле́ч-ам	мор-ам
Тв.	пле́ч-амі	мор-амі
Ме́с.	пле́ч-ах*)	мор-ах

*) Можна ўжываць і форму плячмі, плячыма́, на плячох.

Адзіночны лік.

Н. В. К.	5) жыцьц-ё	6) пол-е
Род.	жыцьц-я	пол-я
Дав.	жыцьц-ю	пол-ю
Тв.	жыцьц-ём	пол-ем
Ме́с.	жыцьц-ці	пол-і

Множны лік.

Н. В. К.	. .	пал-і
Род.	. .	пал-ёў
Дав.	. .	пал-ём
Тв.	. .	пал-ямі
Ме́с.	. .	пал-ёх

§ 27. Увагі аб канча́тках.

1) Ме́сны склон адз. л. мае чатыры канчаткі: *е, і, ы, у*, якія ўжываюцца так, як у іме́ньнях мужчынскага роду, напр.:

а) у сяле́, пры вакне́, у гумне́, на сукне́, аб пісьме́ і г. д. (канчатак *е* пад націскам).

на се́не, у ле́це, на це́ле, у слове, на не́бе, на пале́не, і г. д. (канчатак не пад націскам).

b) аб дабры, на плячы, пры гумянцы, на моры, у горы, пры вогнішчы, на сэрцы, на ваконцы, на сонцы і г. ц.

c) іме́ньні на *к* перад канчаткам маюць *у*: ве́ка—аб ве́ку, вока—аб воку.

d) у лахмацьці, у жыцьці, на гальлі, у чытаньні, пры здарэньні, на полі і г. д.

Задачка. Вывесьці правіла, калі ўжываецца які канчатак.

2) Назоўны склон мн. ліку мае канчаткі *і, ы:* гумны, бярве́ньні, палі, азёры, здарэньні і г. д.

3) Родны склон мн. л. можа ўжывацца або з **канчаткам** оў (аў) або без канчатку: вядзёр—вёдраў, красён—кроснаў, пле́ч—пле́чаў і г. д.

4) Трэба заўважыць розьніцу ў націску: сяло — сёлы, вядро — вёдры, вакно — вокны; але—два, тры, чатыры сялы, вядры, вакны і г. д.

5) Слова ярмо ў множным ліку мае ёрмы (але—два, тры, чатыры ярмы).

§ 28. *Вока і вуха* скланяюцца гэтак: вока, вока, воку, вокам, на воку; вочы, вачэй, вачом, вачмі, аб вачох; вуха, вухам, у вусе; вушы, вушэй, вушом, вушмі, аб вушох.

§ 29 Словы з устаўкаю *эн*, *ат*, *эс*. Сюды прыналéжаць: 1) імéньні на *мя*: імя, плямя, цéмя, рамя, стрэмя і 2) гэткія як цяля, парася, зярня, ваўчаня, княжа і іншыя*).

Адзіночны лік.

Н. В. К.		імя	ягня,	ягнё
Род.	імéньня,	імя	ягняці	
Дав.	імéньню,	імю	ягняці	
Тв.	імéньнем,	імем	ягнём	
Мéс.	імéньні,	імі	ягняці	

Множны лік.

Н. В. К.	імéньні	ягняты
Род.	імéньняў	ягнят, -аў
Дав.	імéньням	ягнятам
Тв.	імéньнямі	ягнятамі
Мéс.	імéньнях	ягнятах

Устаўку *эс* знаходзім у множным ліку слова кола — калёсы*) ды нéба — нябёсы.

*) Побач з формамі цяля, зярня, ваўчаня, княжа можна ўжываць формы на *о* (*ё*) і *нё*: цялё, парасё, зярнё, ваўчанё, княжо і іншыя.

**) Множны лік ад кола: *калёсы* зьмяніў сваё значэньне і значыць павозка.

Задачка. 1) Праскланяй: плямя, цяля, ваўчаня, княжа. 2) Што значыць *колы* і што значыць *калёсы*?

III. Жаноцкі род.

§. 30. А. Імéньні жаноцкага роду на а.

Лік адзіночны.

Наз.	1) галав-а	2) калін-а
Род.	галав-ы*)	калін-ы
Дав.	галав-é	калін-е
Він.	галав-у	калін-у
Тв.	галав-ою (ой)	калін-аю (ой)
Мéс.	галав-é	калін-é

Лік множны.

Наз.	галов-ы	калін-ы
Род.	галоў, галов-аў	калін-аў
Дав.	галов-ам	калін-ам
Він.	як Назоўны	
Тв.	галов-амі	калін-амі
Мéс.	галов-ах	калін-ах

Лік адзіночны.

Наз.	3) рук-а	4) горк-а
Род.	рук-і	горк-і
Дав.	руц-э	горц-ы
Він.	рук-у	горк-у
Тв.	рук-ою(ой)	горк-аю (ай)
Мéс.	руц-э	гор-цы

*) Гэткія формы, як галавэ, зарэ, зямлé, ужываюцца дужа рэдка.

Лік множны

Наз.	рук-і	горк-і
Род.	рук	гор-ак, горк-аў
Дав.	рук-ам	горк-ам
Він.	як Назоўны	
Тв.	рук-áмі	горк-амі
Мéс.	рук-áх	горк-ах

Лік адзіночны.

Наз.	5) зар-á	6) зямл-я	7) дол-я
Род.	зар-ы	зямл-і	дол-і
Дав.	зар-ы	зямл-і	дол-і
Він.	зар-у	зямл-ю	дол-ю
Тв.	зар-ою(ой)	зямл-ёю(ой)	дол-яю (яй)
Мéс	зар-ы	зямл-і	дол-і

Лік множны.

Наз.	зор-ы	зéмл-і
Род.	зор-аў	зямéль, зéмл-яў
Дав.	зор-ам	зéмл-ям
Він.	як Назоўны	
Тв.	зор-амі	зéмл-ямі
Мéс.	зор-ах	зéмл-ях

§ 31 Увагі аб розных склонах.

1. *Давальны і мéсны склон* адз. л. маюць тую самую фор му. У імéньнях, што маюць перад канчаткам *цьвёрды зычны* гэтыя склоны канчаюцца на *е:* вадзé, галавé, руцэ, сасé, на зé (націск на канчатку); каліне, палавіне, блазноце, рабоц (канчатак бяз націску).

Калі-ж перад канчаткам*) стаіць адзін з ацьвярдзéўшы зычных *р, ц, ч, ж, ш,* або *к* (пасьля *к* тады, кал націск не н

*) Трэба разумéць канчатак назоўнага склону.

канчатку —лаўка, матка, шапка, ласка),то ў давальным і мéсным склоне маем *ы:* зары, гары, мацы, душы, дзяжы, (пад націскам); вуліцы, аборы, кашы, пражы, лаўцы, матцы, шапцы і г. д не пад націскам).

У скланéньні з мягкім зычным перад канчаткам заўсёды маем канчатак *і:* зямлі, сям'і, долі, княгіні, волі, і г. д.

Імéньні з асноваю на *к, г, х* зьмяняюць іх на *ц, з, с:* рука—руцэ, горка—горцы, нага—назé, дарога—дарозе, саха—сасé, страха—страсé, Лявоніха—Лявонісе.

2) *Родны склон* мн. ліку мае часта канчатак — *аў,* як у імéньнях мужчынскага роду: водаў, воронаў, маладзіцаў, зéмляў, надзéляў, пéсьняў і г. д.

Але найчасьцéй ўжываюцца гэткія формы, як дачок, дзявок, гор, зор, кароў, галоў, зямéль, надзéль, сьлёз, лялек, шпілек і г. д. Толькі рук і ног заўсёды без канчатку *аў.*

Радзéй сустракаем канчатак *ей:* сьвінéй, сянéй і інш.

Клічны склон заўсёды аднолькавы з назоўным: Літва, родна зямелька! Жальцеся·звонкія струны.

§ 32. Імéньні муж. р. на а. Так сама, як імéньні жан р. на *а,* скланяюцца імéньні муж р. на *а:* старшыня, стараста, сабака, судзьдзя і інш. Толькі ў тв. скл. часамі сустракаюцца формы мужчынскага скланéньня: з старшынём, старастам, сабакам і г. д.

§ 33. Б. Імéньні жан. р. на зычны.

Сюды адносяцца такія імéньні, як косьць, гразь, соль, мéдзь; ноч, мыш, роскаш, моц; любоў, кроў і падобныя; у ліку множным такія, як сані, сéні, грудзі, гусьлі, дзьвéры, — наагул, усé тыя імéньні ж. р., што ў наз. склоне не канчаюцца на *а.* Апрача гэтага сюды адносяцца: куры, сусéдзі, чэрці.

§ 34. Прыклады.

Лік адзіночны.

Наз.	косьць	рэч	кроў
Род.	касьц-і	рэч-ы	крыв-і
Дав.	касьц-і	рэч-ы	крыв-і
Він.	як Назоўны		
Тв.	касьц-ёю(й)*)	рэч-аю(й)	крыв-ёю (й)
Мéс.	каьц-і	рэч-ы	крыв-і

Лік множны.

Наз.	косьц-і	рэч-ы
Род.	касьц-éй	рэч-аў
Дав.	кась-цём	рэч-ам
Він.	як Назоўны	
Тв.	касьц-ямі, касьць-мі	рэч-амі, рач-мі
Мéс.	касьц-ёх	рэч-ах

§ 35. Увагі аб склонах.

1) *Родны склон* мн. л. мае канчатак *ей*, *ой* (не пад націскам *ай*, *аў*): касьц-éй, пéч-аў, рэч-аў, ноч-аў і г. д.

2) *Творны склон* апрача паказаных у прыкладах канчаткаў мае часамі—ма: касьцьма, саньма і г. д.

3) *Клічны склон* заўсёды аднолькавы з назоўным у абодвух ліках, як і ў імéньнях жан. р на *а*.

§ 36. Маці скланяецца гэтак:

Наз.	маці	Він.	маці
Род.	маці	Тв.	—
Дав.	маці	Мéс.	маці
	Клічны.	маці	

У множным ліку знаходзім маці толькі ў Наз. Він. і Кл. скл.

*) здараюцца часта і гэткія формы, як косьцю, рэччу і г. д.

У тых склонах, дзе ня ўжываецца маці, яго замяняе матка: маткаю, матак і г. д.

§ 37 *Вінавальны склон* імéньняў, што азначаюць чалавéка, зьвéра і наагул нéшта жывое, аднолькавы з родным склонам у муж. р. адзіночнага ліку: бачу брата, мужа, паю каня. Імéньні, што азначаюць няжывое, маюць вінав. склон аднолькавы з назоўным: нясі стол, сячы дуб, мéць рубéль (хоць часамі і сячы дуба, мéць рубля).

У множным ліку толькі імéньні, што азначаюць чалавéка, асобу, маюць він. скл. аднолькавы з родным; усé іншыя—аднолькавы з назоўным: бачу братоў, люблю сваіх сёстраў, але ганю валы, паю коні, лаўлю авéчкі і г. д., як роблю сталы, сані, бачу хаты і інш.

Прымéта.

§ 38. Прымéтаю называецца часьціна мовы, што мае рады (муж., жан. і ніякі) і скланяецца: сьвяты, сьвятая, сьвятое; сіні, сіняя, сіняе і інш.

§ 39. Прыклады.

1) Лік адзіночны.

Н.	сьвят-ы	сьвят-ая	сьвят-ое
Р.	сьвят-ога	сьвят-ое (й)	сьвят-ога
Д.	сьвят-ому	сьвят-ой	сьвят-ому
В.	як Н. або Р.	сьвят-ую	як Н.
Т.	сьвят-ым	сьвят-ою (ой)	сьвят-ым
М.	сьвят-ым	сьвят-ой	сьвят-ым

Лік множны.

Н.	сьвят-ыя	для ўсіх р.
Р.	сьвят-ых	
Д.	сьвят-ым	
В.	як Н. або Р.	
Т.	сьвят-ымі	
М.	сьвят-ых	

Лік адзіночны.

Н.	бос-ы	бос-ая	бос-ае
Р.	бос-ага	бос-ае (ай)	бос-ага
Д.	бос-аму	бос-ай	бос-аму
В.	як Н. або Р.	бос-ую	як Н.
Т.	бос-ым	бос-аю (ай)	бос-ым
М.	бос-ым	бос-ай	бос-ым

Лік множны.

Н.	бос-ыя	В.	як Н. або Р.	для ўсіх р.
Р.	бос-ых	Т.	бос-ымі	
Д.	бос-ым	М.	бос-ых	

Так сама зьмяняюцца прымéты з мягкім зычным перад канчаткамі:

3) Лік адзіночны.

Н.	сін-і	сін-яя	сін-яе
Р.	сін-яга	сін-яе (яй)	сін-яга
Д.	сін-яму	сін-яй	сін-яму
В.	як Н. або. Р	сін-юю	як Н.
Т.	сін-ім	сін-яю (яй)	сін-ім
М.	сін-ім	сін-яй	сін-ім

Лік множны.

Н.	сін-ія	В.	як Н. або Р.	для ўсіх р.
Р.	сін-іх	Т.	сін-імі	
Д.	сін-ім	М.	сін-іх	

§ 40. Калі націск прыходзіцца на канчатак, то ў родным склоне—óга, калі націск ня прыходзіцца на канчатак, а на аснову, то—ага: сьвяты — сьвятога, добры—добрага, сіні—сіняга, вялікі—вялікага і г. д.

§ 41. Тыя прымéты, што азначаюць *якасьць* (на пытаньне *які?*), могуць мéць тры ступéні гэтае якасьці, або тры **ступéні прыраўнаваньня**:

1-ая ступéнь *звычайная*: зялёны, ая, ае, вялікі, ая, ае;

2-ая ступéнь—*вышэйшая*: зелянéйшы, вялікшы;

3-ая ступéнь—*найвышэйшая*: найвялікшы, найзелянéйшы, або самы зялёны, самы вялікі, ці за ўсіх найзелянéйшы, ад усіх найвялікшы і г. д.

Некаторыя прымéты маюць няправільныя ступéні прыраўнаваньня: добры — лéпшы, найлéпшы; благі—горшы, найгоршы; малы—мéншы, наймéншы.

Задачка. 1. Праскланяйце:

Сіні, чорны, горкі, салодкі, тоўсты, глухі.

2. Напішэце ступéні прыраўнаваньня:

Новы кажух, зялёны сад, вялікі бор, цёплая шапка, шырокае поле, глыбокае мора, сьляпы конь, благі сон, сухі хлéб.

Чысло.

§ 42. Адны чыслы паказаваюць лік (на пытаньне *колькі?*) і называюцца **лічнымі**, другія — парадак (на пытаньне *каторы?*) і называюцца **парадкавымі**.

Чыслы лічныя.	*Чыслы парадкавыя.*
1 адзін, адна, адно	першы аяя, ае
2 два, дзьве, два	другі „ „
3 тры	трэці „ „
4 чатыры	чацьверты „ „
5 пяць	пяты „ „
6 шэсьць	шосты „ „
7 сем	сёмы „ „
8 восем	восьмы „ „
9 дзевяць	дзевяты „ „
10 дзесяць	дзесяты „ „
11 адзінаццаць*)	адзінаццаты „ „
12 дванаццаць	дванаццаты „ „
13 трынаццаць	. . . .
14 чатырнаццаць	. . . .
15 пятнаццаць	. . . .
16 шаснаццаць	. . . .
17 семнаццаць	. . . .
18 восемнаццаць	. . . .
19 дзевятнаццаць	. . . .
20 дваццаць	дваццаты
21 дваццаць адзін	дваццаць першы
30 трыццаць	трыццаты
40 сорак	саракавы

*) Ужываюцца таксама формы: адзінанцаць, двананцаць, трынанцаць, чатырнанцаць і г. д., а таксама адзінанцаты, двананцаты, трынанцаты і г. д.

50 пяцьдзесят	пяцьдзесяты
60 шэсьцьдзесят	шэсьцьдзесяты і г. д.
70 семдзесят	. . . .
80 восемдзесят	. . . .
90 дзевяцьдзесят	. . . .
100 сто	соты
101 сто адзін	сто першы
200 дзьвесьце	двухсоты
300 трыста	трохсоты
400 чатырыста	чатырохсоты
500 пяцьсот	пяцьсоты
600 шэсьцьсот	шэсьцьсоты
700 семсот	семсоты
800 восемсот	восемсоты
900 дзевяцьсот	дзевяцьсоты
1000 тысяча	тысячны
2000 дзьве тысячы	двухтысячны
1,000,000 мілёен	мілёенны

§ 43. Чыслы парадкавыя зьмяняюцца падобна да прыметы: першы, першая, першае; першага, першае і г. д.

Чыслы лічныя зьмяняюцца часта падобна да імя, часамі падобна да прыметы.

§ 44. Адзін, адна, адно.

Н.	адзін	адна	адно
Р.	аднаго	аднае, аднэй	аднаго
Д.	аднаму	аднэй	аднаго
В.	як Н. або Р.	адну	як Н.
Т.	адным	аднэй (ю)	адным
М.	адным	аднэй	адным

Лік множны (для ўсіх радоў).

Н.	адны	В.	як Н. або Р.
Р.	адных	Т.	аднымі
Д.	адным	М.	адных

§ 45 Два (муж. і ніякі р.) **дзьве́** (ж. р.)

Н.	два	дзьве́
Р.	двух (двох)	дзьвюх (дзьвёх)
Д.	двум (двом)	дзьвюм (дзьвём)
В.	як Назоўны	або Родны
Т.	двума (двома)	дзьвюма (дзьвёма)
М.	двух (двох)	дзьвюх (дзьвёх)

Так сама, як *два, дзьве́,* скланяюцца **ободва**, **абе́дзьве**: абодвух, абе́дзьвюх і г. д.

Падобна **тры**, **чатыры**: тры, трох, тром, трыма, трох; чатыры, чатырох, чатыром, чатырма, чатырох.

§ 46. Пачынаючы ад **пяцёх** і да **трыццацёх** чыслы скланяюцца гэтак:

Н.	пяць	трыццаць
Р.	пяцёх	трыццацёх
Д.	пяцём	трыццацём
В.	як Наз.	або Род.
Т.	пяцьма	трыццацьма
М.	пяцёх	трыццацёх

Пачынаючы ад **пяцьдзесят** і да **дзе́вяцьдзесят** чыслы зьмяняюцца *як пяць*, або найчасьце́й зусім **не зьмяняюцца**: з усімі пяцьдзесят людзьмі, з **усіх дзе́вяцьдзесят** снапоў і г. д.

§ 47. **Сорак і сто**.

Н.	сорак	сто
Р.	сараку	сту
Д.	сараку	сту
В.	як Наз.	
Т.	саракма	стома
М.	сараку	сту

§ 48. Чыслы 200, 300, 400 і дале́йшыя або зусім *не зьмяняюцца*, або зьмяняюцца гэтак: дзьве́сьце, двухсот, двумстам, двумастамі і г. д.

§ 49 Абое, двое, трое.

Н.	абое	двое	трое
Р.	абаіх, абайга́	дваіх, двайга́	траіх, трайга́
Д.	абаім	дваім	траім
В.	як Наз. або Род.		
Т.	абайма	двайма	трайма
М.	абаіх	дваіх	траіх

Так сама **чацьвёра**, **пяцёра** і *дале́йшыя*: чацьвярох, чацьвяром, чацьвярма, чацьвярох (хоць часта яны зусім не зьмяняюцца).

§ 50. *Дробныя чыслы*, зложаныя з *поў*—паўтара (муж. і ніякі р.), паўтары (ж. р.) паўтрацьця, паўтрацьці не зьмяняюцца.

§ 51. Трэба ве́даць, што *абодва* ўжываецца для азначэньня толькі муж. і нік. р. (абодва браты, абодва вакны); *абе́дзьве*—толькі жаноцк. р. (абе́дзьве сястры, абе́дзьве сахі); *абое*— калі рады памяшаны (абое—рабое; кабыла лысая, жарабя рабое, зьеў воўк абое).

§ 52. Задачка. 1. Напішы словамі: 1.289, 3.478, 11.696, 953, 12.418; 1.724-ы (тысяча семсот дваццаць чацьве́рты), 15.919-ы, 837-ы, 956-ы.

2. Праскланяй: адна саха, два валы, дзьве́ дошкі, трое сане́й, дзе́вяць братоў, сто дваццаць восем грыбоў.

Займя.

§ 53. Займя ўжываецца заме́ста імя, прыме́ты або чысла (за-імя). Напрыклад:

Хадзіў ці доўга *ён* ці мала,
Ды толькі не́шта адзін раз
Бяда ў бары *яго* спаткала...
Во як казаў нам *сам* Тарас.

(Тутака *ён, яго, сам* заме́ста Тарас, Тараса).

Заме́ста „добры, бе́лы, малы“, можам сказаць „такі, той“; заме́ста „пяты, дзесяты — „той, гэны“ і г. д.

§ 54. Вось часьце́й ужываныя займе́ньні:

1. *Асабовыя:* я, ты, ён, яна, яно; мы, вы, яны.
2. *Зваротныя:* сябе́ і ся (мыю-ся).
3. *Прыналё́жныя:* мой, твой, свой, нашы, вашы, іхны і інш.
4. *Паказальныя:* гэты, гэны, той, такі, гэткі і інш.
5. *Пытальныя:* хто? што? які? каторы? чый? і інш.
6. *Адносныя:* тыя самыя, што пытальныя, але бяз пытаньня.
7. *Азначальныя:* уве́сь, усякі, усялякі, кожны, сам, самы.

8. *Неазначальныя:* не́хта, не́шта, не́які і не́йкі, не́чый, хтось, штось, хтосьці, не́якісь, чыйсь і інш.
9. *Адмоўныя:* ніхто, ніщто, нічый, ніякі, ніводны і інш.

Увага. Займе́ньні *я, мы* называюцца займе́ньнямі першае асобы; *ты, вы* — другое, *ён, яна, яно, яны* — трэцяе.

Займе́ньні скланяюцца, а некаторыя маюць і роды: мой, мая, маё; нашы, нашая, нашае і інш.

§ 55 Асабовыя: я, ты, мы, вы. ён, яна, яно, яны.

	Лік адзіночны.		Лік множны.	
Н.	я	ты	мы	вы
Р.	мяне́	цябе́	нас	вас
Д.	мне́	табе́	нам	вам
В.	мяне́	цябе́	нас	вас
Т.	мною (ой)	табою (ой)	намі	вамі
М.	мне́	табе́	нас	вас

	Лік адзіночны.			Лік множны.
Н.	ён	яна	яно	яны
Р.	яго	яе́	яго	іх
Д.	яму	ёй	яму	ім
В.	яго	яе́	яго	іх
Т.	ім	ёю (ёй)	ім	імі
М.	ім	ёй	ім	іх

§ 56 Сябе́

Н.	—	В.	сябе́
Р.	сябе́	Т.	сабою (ой)
Д.	сабе́	М.	сабе́

§ 57. Мой, твой, свой, чый.

Лік адзіночны.

Н.	мой	мая	маё
Р.	майго	мае́ (й)	майго
Д.	майму	маёй	майму
В.	як Н. або Р.	маю	маё
Т.	маім	маёю (ёй)	маім
М.	маім	маёй	маім

Лік множны.

Н.	мае́	В.	як Н. або Р.
Р.	маіх	Т.	маймі
Д.	маім	М.	маіх

Так сама *чый, чыя, чыё*.

§ 58. Сам, сама, само.

	Лік адзіночны.			Лік мн.
Н.	сам	сама	само	са́мі
Р.	самога	самае́ (ой)	самога	самых
Д.	самому	самой	самому	самым
В.	самога	самую	само	самых
Т.	самым	самою (ой)	самым	самымі
М.	самым	самой	самым	самых

§ 59. Той, тая, тое.

	Лік адзіночны.			Лік мн.
Н.	той	тая	тое	тыя
Р.	таго	тае́ (тэй)	таго	тых
Д.	таму	тэй	таму	тым
В.	як Н. або Р.	тую	як Н.	як Н. або Р.
Т.	тым	тэй (ою)	тым	тымі
М.	тым	тэй (ой)	тым	тых

§ 60. Хто, што.

Н.	хто	што	В.	каго	што
Р.	каго	чаго	Т.	кім	чым
Д.	каму	чаму	М.	кім	чым

§ 61. Уве́сь, уся, усё.

Лік адзіночны.

Н.	уве́сь	уся	усё
Р.	усяго	усяе́ (е́й)	усяго
Д.	усяму	усёй	усяму
В.	як Н. або Р.	усю	як Н.
Т.	усім	усёю (ёй)	усім
М.	усім	усёй	усім

Лік множны.

Н.	усе́	В.	як Н. або Р.	для усіх р.
Р.	усіх	Т.	усімі	
Д.	усім	М.	усіх	

§. 62. Такія займе́ньні, як **нашы**, **гэны**, **кожны**, **які**, **такі і інш.**, скланяюцца як прыме́ты: нашы, нашага, нашаму і г. д.

§ 63. Увагі аб розных склонах.

1) Побач з формамі роднага склону адз. л. муж. і ніякага р на — *о* (каго, чаго, яго і інш.) ужываюцца і формы на — *а* (кага́, чага́, яга́, тага́, усяга́, чыйга́, майга́, твайга, свайга, а таксама слоў зложаных з гэтых займе́ньняў: сяга́ньня, сяга́лета).

2) У творным склоне ж. р. формы — — ою ёю звычайне́й у беларускай мове за кароткія формы на — ой, ёй.

3) Побач з формамі нашы, нашая, нашае ўжываюцца скарочаныя наш, наша, наша.

§ 64 Задачка. Праскланяй:

Мой добры конь, гэты самы замок, сам гаспадар, увесь хлеб, усялякая работа, сама гаспадыня, тая прыгожая краска, гэтае дзіця, маё дабро, чыё пяро, хто такі, што такое.

Дзеяслоў.

§ 65. Дзеясловам называецца такое *слова*, што азначае *стан* (ляжаць, сядзець, спаць) або *дзеяньне*)* (браць, рубаць).

Дзеяслоў зьмяняецца ў часе, ліку і асобе.

§ 66. Часоў—тры: цяперашні, прошлы і будучы.
Напр.: я пішу (цяпер. час)
я пісаў (прошлы час)
я буду пісаць
я напішу } будучы час

Лікі—два: адзіночны і множны.
Напр.: я пішу, ты пішаш, ён, яна, яно піша (лік адз.); мы пішам, вы пішаце, яны пішуць (лік мн.).

Асобы—тры: першая, другая і трэцяя.

Напр.: *я* пішу, *мы* пішам (1-я асоба); *ты* пішаш, *вы* пішаце (2-я асоба); *ён, яна, яно* піша, *яны* пішуць (3 я асоба).

§ 67. Зьмена дзеяслова ў часох, ліках і асобах называецца **спражэньнем**.

Пры спражэньні дзеяслоў зьмяняецца на **тры лады**: *абвестны, загадны і ўмоўны*.

Абвестны лад „абвяшчае“ што было, што ёсьць і што будзе: хадзіў, хаджу, буду хадзіць і г. д.

---

*) Дзеля гэтага і называецца дзеясловам.

Загадны лад выражае „загад“ або просьбу, покліч, прасьцярогу ці што падобнае: нясі, зьмілуйся, баранеце, не паваліся і г. д.

Умоўны лад паказавае, што дзеяньне залежыць ад нейкае ўмовы: я зробіў-бы, пайшоў-бы і г. д. (каб хацеў, каб мог).

§ 68. Дзеясловы бываюць двух **трываньняў**: *закончанага і незакончанага*. Закончанае адказвае на пытаньне *што зробіць?* (прыйсьці, прынясьці, прачытаць, напісаць і г. д.); незакончанае—на пытаньне *што робіць?* (ісьці, чытаць, пісаць і г. д.).

§ 69. Некаторыя дзеясловы могуць мець розныя *станы*: б'ю, біты, б'юся; роблю, роблены, роблюся; мыю, мыты, мыюся і г. д. Усе гэтыя дзеясловы маюць тры станы: *дзейны* (або актыўны), *залежны* (або пасыўны) і *сярэдні*.

Дзейны стан паказавае, што нейкая асоба або рэч сама нешта „дзеіць“ і яе дзеяньне пераходзіць на другую рэч: куля *разьбіла* вакно, майстры *будуюць* дом і г. д. (разьбіла, будуюць—дзейны стан). Пасьля дзейнага стану можна паставіць пытаньне каго? што? (вакно, дом).

Калі-ж скажам:вакно *разьбіта* куляю, дом *будуецца* майстрамі, то будзем мець залежны стан. Пры ім стаіць пытаньне *кім? чым?* (куляю, майстрамі).

Сярэдні стан складаецца з дзейнага і займя—ся і азначае або *зваротнае* дзеяньне (мыюся, чашуся — мыю сябе, чашу сябе) або *супольнае* (цалуюся, сустракаюся—з кім? з чым?).

Ад іншых дзеясловаў нельга тварыць розных станоў: баяцца, сьмяяцца, ісьці, спаць і шмат падобных*).

---

*) аб іх можна было-б сказаць, што яны *ніякага стану*

§ 70. Такія формы, як лётаць, сядзéць, ламаць, паваліцца, задумацца, магчы, сячы і інш. (на пытаньне *што робіць?*) называюцца *неазначальнымі формамі*)*. Яны не азначаюць ні часу, ні ліку, ні асобы, толькі паказаваюць названьне дзéяньня ці стану.

Увага. Побач з формамі на — *ць* ужываюцца формы на *ці:* лётаці, ламаці, хадзіці, задумаціся, валіціся і г. д.

§ 71. Цяпéрашні час для кожнае асобы абодвух лікаў мае асобныя канчаткі, напр.: няс-*у*, няс-*éш*, няс-*é(ць)*, няс-*ём*, няс-*іцё*, няс-*уць;* стаю, ста-*іш*, ста *іць*, ста *ём*, ста-*іцё*, ста-*яць*.

Дзеясловы, што маюць у канчатку 2 ас. адз. ліку—*éш*, а ў 3 ас. мн. л.—*уць* (юць), налéжаць да **пéршага спражэньня**, напр.: няс-*éш*, таўч-*эш*, ня-с-*уць*, таўк-*уць;* будз-*еш*, каж-*аш*, буд-*уць*, каж-*уць* (не пад націскам у мягкім складзе *е*, у цьвёрдым *а*).

Тыя дзеясловы, што маюць у 2 ас. адз. л. — *іш*,—*ыш*, а ў 3 ас. мн. л. — *аць*, — *яць*, налéжаць да **другога спражэньня**.

§ 72. **Пéршае спражэньне**.

1. Асабовыя канчаткі пад націскам.

Лік адзіночны.

1 ас.	няс-у	пяк-у
2 ас.	няс-éш	пяч-эш
3 ас.	няс-é(ць)	пяч-э(ць)

Лік множны.

1 ас.	няс-ём	пяч-ом
2 ас.	няс-іцё	пяч-ыцё
3 ас.	няс-уць	пяк-уць

*) інакш неазначальным ладам.

2) Асабовыя канчаткі не пад націскам.

Лік адзіночны.

1 ас.	дума-ю	каж-у
2 ас.	дума-еш	каж-аш
3 ас.	дума-е(ць)	каж-а(ць)

Лік множны.

1 ас.	дума-ем	каж-ам
2 ас.	дума-еце	каж-аце
3 ас.	дума-юць	каж-уць

§ 73. **Другое спражэньне**.

1) Асабовыя канчаткі пад націскам.

Лік адзіночны.

1 ас.	сядж-у	крыч-у
2 ас.	сядз-іш	крыч-ыш
3 ас.	сядз-іць	крыч-ыць

Лік множны.

1 ас.	сядз-ім	крыч-ым*)
2 ас.	сядз-іцё	крыч-ыцё
3 ас.	сядз-яць	крыч-аць

2) Асабовыя канчаткі не пад націскам.

1 Лік адзіночны.

1 ас.	пал-ю	гавар-у
2 ас.	пал-іш	гавор-ыш
3 ас.	пал-іць	гавор-ыць

*) або: сядзём, баёмся, крычóм, маўчом і г. д.

Лік множны.

1 ас.	пал-ім	гавор-ым
2 ас.	пал-іце	гавор-ыце
3 ас.	пал-яць	гавор-аць

Увага. Здараюцца і такія формы, як гоне, гавора, падобна да будзе, скажа і г. д.

§ 74. Прошлы час.

Лік адзіночны.

1 ас.	я	нёс, нясла, нясло
2 ас.	ты	
3 ас.	ён, яна, яно	веў, вяла, вяло і г. д.

Увага. Часамі здараецца час *запрошлы*: я быў прынёсшы, зробіўшы, пайшоўшы і г. д. (пе́рш, чымся што другое здарылася).

§ 75 Будучы час мае дзьве́ формы: *простую* *складаную*:*) я зраблю, я буду робіць.

Простая форма спрагаецца так сама, як цяпе́рашні час. Напр.: я зраблю, ты зробіш, ён зробіць; мы зробім, вы зробіце, яны зробяць.

Складаная форма зложана з будучым часам ад „быць“ і неазначальнай формай таго слова, што спрагаецца:

*) дзеясловы закончанага трываньня маюць будучы просты: пайду, зраблю; незакончанага—будучы складаны: буду хадзіць, буду робіць.

Лік адзіночны.		Лік множны.	
я буду	робіць	мы будзем	робіць
ты будзеш		вы будзеце	
ён будзе		яны будуць	

Увага. Здараецца час *прадбудучы*: я буду пайшоўшы, буду ўстаўшы і г. д. (пе́рш, чымся што другое зробіцца).

§ 76. Загадны лад.

I Лік адзіночны.

1 ас.	— — — — — —
2 ас.	няс-і бяр-ы
3 ас.	хай (няхай) няс-е́(ць), бяр-э(ць).

Лік множны.

1 ас.	няс-е́ма,	бяр-эма*)
2 ас.	няс-е́це	бяр-эце
3 ас.	хай (няхай няс-уць	бяр-уць)

II Лік адзіночны.		Лік множны.
1 ас.	— — —	бра́зьнема
2 ас.	бразьні	бра́зьнеце
3 ас.	хай бразьне	хай бразнуць

III Лік адзіночны.		Лік множны.
1 ас.	—	чуйма лійма
2 ас.	чуй лі	чуйце лійце
3 ас.	хай чуе хай ліе́	хай чуюць хай ліюць

*) могуць ужывацца і формы: нясе́м, бярэм і г. д.

IV. Лік адзіночны.		Лік множны.
1 ас.	—	кіньма е́жма
2 ас.	кінь е́ж	кіньце е́жце
3 ас.	хай кіне хай е́сьць	хай кінуць хай ядуць

Другая асоба адзіночнага ліку мае канчаткі:

I. *і*, *ы* пад націскам — нясі, хвалі, калі, мані, мялі, сушы, бяры, памажы, валачы і інш.

II. *і* не пад націскам — вымі, бразьні, пісьні і інш.

III. *й* пасьля галоснага — дай, гуляй, ме́й, чуй, стой, крый, мый, шый і інш. (формы лі, ві, бі, пі заме́ста лій, вій, бій, пій).

IV. Зычны мягкі і ацьвярдзе́ўшы — кінь, сядзь, ле́зь, е́ж, рэж, кале́ч, скоч, роб, прамоў, саромся і інш.

Калі да гэтых формаў даставім канчатак — *ма* (або *м*), то дастанем 1-ю асобу мн. ліку; калі даставім — *це*, то дастанем 2-ую асобу мн. ліку. Пры гэтым у дзеясловах, як нясі, бяры (бач I), бразьні (бач II) трэба зьмяніць *і* на *е*, *ы* на *э*: нясі, нясе́ма, нясе́це; бяры, бярэма, бярэце, бразьні, бразьнем (ма), бразьнеце і г. д.

Трэцяя асоба складаецца з *хай* або *няхай* і трэцяе асобы цяпе́р. часу: хай ён кажа, хай яны кажуць.

§ 77. Умоўны лад дастанем, прыставіўшы частку *бы* або *б* да прошлага часу: я пашоў-бы, зробіў-бы, прынёс-бы і г. д.

§ 78. Некаторыя дзеясловы зрастаюцца з зваротным займе́ньнем — ся: мыцца (мыць-ся), вучыцца (вучыць-ся) і інш. Пры спражэньні займя дадае́цца да слова: мыюся, мыешся і г. д. Толькі ў 3 асобе канчатак *ць-ся* зьліваецца ў *цца**): ён мыецца, яны мыюцца

§ 79. Ад дзеяслова можна вывесьці другія часьціны мовы: **дзеяслоўнае імя** (стварыць — стварэньне), **дзеяслоўную прыме́ту** (чытаць — чытаючы (й), чытаючая, чытаючае; чытаўшы (й), чытаўшая, чытаўшае; чытаны, чытаная, чытанае) і **дзеяслоўнае прыслоўе** (сяджу *чытаючы*, прыду *прачытаўшы*).

Дзеяслоўнае імя скланяецца так сама, як і кожнае другое імя: стварэньня, стварэньню і г. д.

Дзеяслоўная прыме́та мае рады і скланяецца як прыме́та: чытаючы, чытаючая, чытаючае, чытаючага, чытаючаму і г. д. Але побач з гэтым яна мае часы, як дзеяслоў: цяпе́рашні (чытаючы, ая, ае) і прошлы (чытаўшы, ая, ае; чытаны, ая, ае).

Увага. Формы на — учы, — ючы, — ўшы больш старасьве́цкія і кніжныя. У жывой мове ня скажуць, напр., „ад чытаючага чалаве́ка можна шмат вымагаць“, але „ад чалаве́ка, што чытае, можна шмат вымагаць“. У жывой мове скланяюцца толькі формы дзеяслоўнае прыме́ты на — ены і — ты: зроблены, зробленага, зробленаму і г. д.; біты, бітага, бітаму і г. д.; бітая, бітае, бітай і г. д.

Дзеяслоўнае прыслоўе мае два часы — цяпе́рашні (чытаючы, лётаючы, пішучы, ходзячы, робя-

---

*) Калі перад — ца стаіць зычны, то пішацца адно *ц*: здасца, ад'есца і г. д.

чы) і прошлы (чытаўшы, лётаўшы, пісаўшы, хадзіўшы, робіўшы). Дзеясloўнае прыслоўе не скланяецца і не спрагаецца*).

§ 80. Дзеясловы **есьці**, **даць**, **быць** маюць асобнае спражэньне.

Лік адзіночны.			Лік множны.	
1 ас.	ем	дам	ямо**)	дамо
2 ас.	ясі	дасі	ясьцё	дасьцё
3 ас.	ёсьць	дасьць	ядуць	дадуц

„Ем“ — гэта цяпе́рашні час, „дам„ — будучы час.

„Быць“ мае ў цяпе́р. часе толькі форму 3-е асобы адзін. ліку: ёсьць (або кароткае—ё). Будучы час: буду, будзеш, будзе і г. д.

Загадны лад: е́ж, дай, будзь; хай е́сьць, хай дасьць, хай будзе; е́жма, дайма, будзьма; е́жце, дайце, будзьце; хай ядуць, дадуць, будуць.

Другія формы складаюцца звычайна.

§ 81. Задачка 1. Праспрагай у цяпе́рашнім часе і аддзялі рыскаю асабовыя канчаткі дзеясловаў:

Жну, цягну, бяруся, тачу, лаўлю, гарую, цягаю, сушуся, валакуся, таўку, мушу, люблю, сяджу, бягу, магу, даю (даіць), даю (даваць), гнаю, гаю, строюся, крою, паю, пяю, мыюся, крыю, выю, шыю, лію, вію, б'ю, п'ю, гавару, варуся.

2. Праспрагай у будучым часе:

Пісаць, караць, гудзе́ць, гутарыць, зваць; перамяніць гэтыя дзеясловы так, каб можна было ад іх стварыць будучы просты (напісаць — напішу і г. д.).

---

*) З чаго і падобна да прыслоўя.

**) Побач з формамі ямо, дамо, ясьцё, дасьцё, маем ядзём, дадзём, ядзіцё, дадзіцё.

3. Праспрагай у прошлым часе:

Нясьці, вязьці, плясьці,ісьці, сячы, таўчы, пячыся, кусацца, ме́ць.

4. Напішы гэтыя дзеясловы ў умоўным ладзе.

5. Напішы ў загадным ладзе:

Хваліцца, калоць, сушыцца, браць, памагаць, валачы, даць, ме́ць, біцца, піць, кінуць, кале́чыць, прамовіць, сароміцца.

Прыслоуе.

§ 82. Прыслоўе ёсьць нязьме́нная часьціна мовы, што азначае розныя акалічнасьці: ме́йсца, часу, прычыны, спосабу дзе́яньня.

Паводлуг гэтага прыслоўі дзе́ляцца на прыслоўі

ме́йсца (на пытаньне — гдзе́?): там, туды, адтуль, адкуль, гэтта, гэнам, вун, блізка і інш.

часу (на пытаньне — калі?): цяпе́рака, сёньня, ле́тась, пазаўчора і інш.

прычыны (на пытаньне — чаму?): таму, чаму і інш.

спосабу дзе́яньня (на пытаньне — як?): добра, хутка, глыбока, ве́льмі, дужа і інш.

§ 83. Большасьць прыслоўяў — гэта акасьцяне́ўшыя формы зьме́нных часьце́й мовы: імя, прыме́ты, займя, чысла, дзеяслова.

Вось некаторыя прыслоўі ад розных склонаў:

1) добра, борзда, сьцюдзена і г. д., вось, **як**, **так**, **колькі**, **толькі**, **не́льга**, **ле́тась**, **зараз**, **упе́рад**,

назад, уздоўж, удоўж, удаўжкі, ушыркі, увышкі, увелькі, насустрэчу. наўзавады, нацямкі, нацянькі і інш. — усё гэта формы назоўнага і вінав. склону.

2) сёлета, сёньня, (сяго-дня), учора, заўтра, зраньня, змалку, здалёку, дагары, звонку і інш. — формы родн. склону.

3) памаленьку, пабеларуску і інш. — формы дав. склону.

4) разам, часам, сілком, кумілем, пехатой і інш. —формы творн. склону.

5) балазе, годзе, запраўды, наадзіноцы, потым, улетку, узімку, папацёмку, паасобку, напотым, уваччу, вонках і інш. — формы меснага склону.

Прыслоўі ад дзеясловаў: няма, нямаш (ня мае, ня маеш), загадзя, наўмысьля, адумысьля, спакваля (зачакаўшы), мусіць, відаць, можа, дзякуй, маўляў і інш.

Шмат прыслоўяў мае свае асобныя прыслоўныя канчаткі (ды, -дэю,-ма, -мі, -ль, -лі, -ка, -ку, -кі, -оў, -чы, -ча і інш): куды, туды, усюды, тады, заўсёды; кудэю, тудэю, сюдэю; кудэма, тудэма, сюдэма; бягма, ляжма, дарма, тойма; вельмі; адкуль, пакуль, дасюль, скуль; калі, ніколі; тутака, тамака, тутачка, тамачка, цяперака, ёсьцека, нямашака, толькі, колькі, гэталькі, далоўкі, дамоўкі; далоў, дамоў; надаячы; апрача, аберуч, насустрэч, некаліс, дзесь, каліс, некалісьці, дзесьці, калісьці; паадноўчы, двойчы, тройчы і шмат інш.

§ 84. Некаторыя прыслоўі маюць **ступені прыраўнаваньня** і зьмяняюцца так, як прыметы, ад якіх яны выводзяцца: зялёна, зеляней, найзеляней.

Вось прыслоўі, што маюць *няправільныя ступені прыраўнаваньня:*

добра--лепш, ляпей; найлепш, найляпей;
блага--горш, гарэй; найгорш, найгарэй;
многа, шмат — больш, балей; найбольш, найбалей;
мала — менш, меней; найменш, найменей.

§ 85. Задачка. Перапішы і падзялі вышэй пералічаныя прыслоўі (§ 83) на месныя, часоўныя і г. д.

Прыймя.

§ 86. Прыймя азначае залежнасьць паміж рэчамі або кірунак дзеяньня: кніжка ляжыць *на* стале, вучань падыйшоў *да* дошкі і г. д.

Прыймя ня ўжываецца само па сабе, а найчасьцей пры імі (дзеля чаго і называецца прыймя): *на* стале, *пры* стале, *пад* сталом, *з-за* стала і г. д.

Але прыймя можа стаяць і пры іншых часьцінах мовы.

Прыймя стаіць найчасьцей пры адным склоне, радзей пры двух або трох, напр.:

пры родн. — без, для, дзеля, да, з-за, з-пад, каля, апрача, у і інш. (без работы, для суседа, дзеля сьвята, да хаты, з-за вугла, з-пад хаты, каля лугу, апрача таго).

пры дав. — к: к хаце, к лесу (але часьцей кажацца да хаты, да лесу).

пры він. — пра, праз, цераз, скрозь, заместа, наўпроці і інш. (кажу пра тое, згінуў праз сваю

нядбаласьць, ішоў цераз поле, скрозь хмары цёмныя).

пры твор. — над: над зямлёй.

пры мéс. — пры, па (пры дарозе, па лясох, па дарогах і г. д.).

пры він. і тв. за, пад, перад, прад і інш. (за яго, за ім, пад стол, пад сталом, перад дом, прад дом, перад домам, прад домам).

пры він. і мéс. у, на, аб і інш. (у лéс, у лéсе, на стол, на сталé, кінуць аб стол, гаварыць абсталé).

пры род., він. і мéс.: з (вярнуўся з работы, сабака ўвéлькі з ваўка, з сахою).

§ 87. Шмат у якіх словах прыймя так цéсна зраслося з асновай, што слова без яго зьмяняе або зусім траціць сваё значэньне: падарожны, пераход, прывычка, (але—ход,—дарожны значыць нéшта другое, а вычка нічога ня значыць).

Некаторыя прыймéньні зусім ня ўжываюцца асобна: уз,- раз,- вы,- пера,- су,- пра,- па,- (уздых, усход, разбор, расход, выгнаць, выйсьці, пераéхаць, сусéд, прадзед, пасынак).

З дзеясловам прыймя заўсёды злучаецца ў вадно непадзéльнае слова: дагнаць, прамяніць, перакінуць, падыйсьці, прыдумаць, засумаваць, падгадаваць, наляцéць, абхапіць, згаварыцца, сьцягнуць, узыйсьці, успомніць, разагнаць, раздаць, расказаць, выдумаць, пераняць, сустрэць і г. д.

Так сама з прыслоўем: запраўды, пазалéтась, зараз, напавéр, уздоўж, спадысподу, даволі, паасобку, потым і г. д.

§ 88. Задачка. 1) Напішы прыклады на тыя прыймéньні, што ня ўжываюцца асобна (уз-, раз- і г. д.).

2. Напішы такія імéньні, што зложаны з прыймéньнямі: за, да, уз, раз, без, з, прад, су, пра, на, ад, вы, пад, аб (засаўка, успамін і г. д.).

З л у ч.

§ 89. Злуч злучае розныя словы ў думцы або розныя думкі: былі ў іх сын *і* дачка; ня мéй сто валоў, *а* мéй сто другоў.

Вось найчасьцéй ужываныя злучы: і, а, але, жа, абы, або, альбо, аж, ажно, ані, адно, няхай, хай, бо, да, ды, дык, аднолька-ж, навет, хіба, ці, няўжо, чымсі, прынамсі, хоць, хаця, такі (ткі), калі, каб, чаго, чаму, таму, нашто, зашто, затое, затым, быццам, не, ні і шмат іншых.

Як можна бачыць у значэньні злучоў часта ўжываецца займя—што, чаго, чаму, такі і інш., часамі з прыймéньнямі — зашто, затое, нашто, натое і інш.

Некаторыя злучы выводзяцца з дзеясловаў: бадай (багдай — бог дай), быццам (ад “быць“), хай, няхай, хоць, хаця і інш.

У значэньні злуча могуць ужывацца так сама прыслоўі: калі, аднолька, прынамсі і інш.

Задачка. Падчыркнуць злучы:

Пуста ў лузе, толькі стагі парыжэўшыя стаяць, ды шпакі каля дарогі цэлы дзéнь адно крычаць. Бачыш, быццам чалавéк, вéкам малады. Жніво ярнае — гэта ўжо восень

і, як той кажа, работак восем. А як надойдзе ўжо Пакрова, то не наесца ў полі карова, бо ўжо золкі вётрык павее, трава пажоўкне і пачарнее. Часам, як у полі з коньмі начуеш, пяючы «восень» дзяўчат пачуеш і, сказаць праўду, дык, мой ты браце, ад гэнай песьні за сэрца хваце, бо яе тая працяжная нота, хоць сьлёзы гоніць, слухаць ахвота.

К л і ч.

§ 90. Кліч выражае ўчуцьцё або паказвае розныя зыкі, да якіх чалавек сваім голасам хоча прыпадобніцца, напр.: учуцьцё болю, радасьці, зьдзіўленьня: ай, аей! ого-го! ага! ах! ох! ух! а-ха-ха і г. д.; шшш! гаў-гаў-гаў! курняў! іга-га-га! ау-ау-ау! і інш.

Каб паказаць, што нешта канчаецца ў адзін мамэнт, ужываюцца асобныя формы клічу ад дзеяслова: хап, брык, бэнц, бох, бабух, хлюпсьць, грук, стук, бахець, хапець, мялькець, піхець, грымоць і інш.

III.

Падзел слова.

§ 91. Карэнь, канчатак, прыстаўка, устаўка.

Словы — настольнік, застольны, стольніца, сталаўнік, сталяр — маюць карэнь *стол;* словы—засьценак, прысьценак, сьценны, сьцяна—маюць карэнь *сьцен;* словы—лес, лясун, лясьнік, лесавік — маюць карэнь *лес* і г. д.

Каранёў дзяліць нельга.

Карэнь *ёсьць такая непадзельная часьць слова, ад каторае можна тварыць другія родныя паміж сабою слова.*

Сам па сабе карэнь можа быць часам асобным словам — стол, лес; але найчасьцей ён асобна зусім ня ўжываецца: сьцен-, лож-, вод- і г. д.

Каб пазнаць які галосны стаіць у карані, трэба зьмяніць слова так, каб націск прышоўся на галосны: засьцен-ак, сьцен-ны (хоць у такім разе, як сьцяна, чуваць *а*).

Зычныя так сама могуць зьмяняцца стоячы ў канцы караня: воўк—воўч-а, дуг-а—дуз-е, лаўк-а

— лаўц-ы, гарох—гарос-е, нарог—нароз-е, дарог-а— дарожн-ы і г. д.

Пры скланéньні і спражэньні апошнія склады слова зьмяняюцца: стал-а, стал-у, стал-ом, стал-é; стал-ы, стал-оў, стал-амі, стал-ох; маўч-у, маўч-ыш, маўч-ыць; маўч-ом, маўч-ыцё, маўч-аць і г. д. Гэтыя зьмéнныя склады таго самага слова называюцца *канчаткамі*.

Тая нязьмéнная часьць слова, што стаіць паміж каранём і канчаткам, называецца *ўстаўкай*: застоль-*н*-ы, застоль-*н*-ага, і г. д.; ляс-*ун*, ляс-*ун*-а і г. д.; гаспад-*ар*, гаспад-*ар*-а і г. д.

Кожная ўстаўка прыдаé караню асобнае значэньне.

§ 92. Вось некаторыя ўстаўкі імя, прымéты і дзеяслова:

1. Устаўкі імéнныя:

ар, ец, ік, (ык), ок, цель, ыр, ун і інш. азначаюць нéшта ажыўленае, дзéйнае: гаспад-ар, стал-яр, знах-ар, куп-éц, хлап-éц; лясьн-ік, муж-ык, язд-ок, вучы-цель, багат-ыр, скак-ун і г. д.

іч, овіч, евіч і інш. азначаюць патомкаў і фаміліі: Баб-іч, Богдан-овіч, Марцінк-éвіч.

ць, асьць, ін(я), ын(я) і інш. азначаюць словы непрадмéтныя жан. р. — памя-ць, люб-асьць, велічыня, глыб-іня і г. д.

л (а), **ішч** (а),- **ышч** (а), **ств** (о) і інш., для азначэньня неажыўленых слоў ніяк. р.: мы-л-а, шыл-а, вогн-ішч-а, пажар-ышч-а, хара-ств-о і г. д.

Некаторыя ўстаўкі прыдаюць слову павялічанае або памéншанае значэньне (*павялічальныя* і *памяншальныя* ўстаўкі): лап-ішч-а, лап-к-а.

Дужа часта памяншальныя ўстаўкі прыдаюць ласкавае значэньне слову: брат-к-а, сястр-ыц-а, лéц-ейк-а і шмат інш.

2. Устаўкі прымéтныя:

к, ок, р, л, н, ав, ів, ат, іст, ав-ат, аньк, еньк, ан (ян), **ов, ск** і інш.—лёг-к-і, глыб-ок-і, шчод-р-ы, вéт-л-ы, вéр-н-ы, ласк-ав-ы, міласьц-ів-ы, зуб-ат-ы, зярн-іст-ы, бел-ав-ат-ы- добр-аньк-і, дараг-éньк-і, мядз-ян-ы, ял-ов-ы, гаспадар-ск-і і г. д.

3. Устаўкі дзеяслоўныя:

ну — **н** — цяг-ну-ць, цяг-н-еш;
і — **е** — хвал-і-ць, сядз-е-ць;
а — **я** — бр-а-ць, сé-я-ць;
ава — **у***) — баран-ава-ць, баран-у-ю, гандл-ява-ць, гандл-ю-ю і г. д.

Тыя прыймéньні, што неразьдзéльна зрасьліся з словам называюцца **прыстаўкамі**: на-стаўнік, паставіць, за-гадка, уз-рост, усь-цягнуць, пера-ход, а-сьцярожны, ад-біць, па-малéньку, на-ўцéкі і г. д.

Карэнь злучаны з прыстаўкай і ўстаўкай называецца **асновай** слова. Такім парадкам пры скланéньні і спражэньні **дадаём канчаткі** да асновы слова.

*) Як баран-ава-ць, баран-у-ю, дужа часта здараецца расказаваць — расказую, перапісаваць — перапісую і г. д. замéста перапісваю, расказаваю або перапісваю, расказваю.

Апрача слоў простых, што маюць толькі адзін карэнь, ёсьць словы складаныя, што маюць два карані: палу-дзень, поў-нач, пара-ход, люда-ед, начлег і шмат інш.

Задачка. Падзялі на часьці і напішы карэнь кожнага слова:

Гародчык, вада, краска, лявоніха, мяцеліца, нядоля, Беларусь, беларускі, красавік, веснавы, месяц, пляменьнік, звада, вучыцель, вучыцелька, земляроб, панядзелак, асьцярожны, леташні. Няма служкі для пастушкі.

IV.

Правапіс.

§ 93. Правапіс дае нам правілы, як трэба пісаць у тых разох, калі пішацца ня так, як чуваць.

У беларускім правапісе трэба ведаць перад усім два найпершыя правілы: адно аб пісаньні галосных, другое — зычных.

Галосныя так пішуцца, як вымаўляюцца: сталы, валы, сьцяна, лясы і г. д, (а не сьцена, лесы, столы, хоць карані слоў: стол-, вол-, сьцен-, лес-).

Зычныя, наадварот, пішуцца глядзячы на тое, які зычны ў карані, прыстаўцы ці канчатку: мёд, калодка, падтрымаць, мыешся і г. д. (а ня так, як чуваць — мёт, калотка, паттрымаць, мыесься — дзеля таго, што карэнь мё*д*-, коло*д*-, прыстаўка — по*д*, канчатак — *ш**).

Ад гэтых правілаў здараюцца дзе-ня дзе адступленьні.

§ 94. Галосныя. *Аканьне*. Галосны *о* можа быць толькі пад націскам; ва ўсіх іншых складох *о* замяняецца на *а*: д*о*м, ст*о*л, гар*о*д, в*о*дны, в*о*кны, дабр*о*, але д*а*мы, ст*а*лы, гар*а*ды, в*а*да, в*а*кно, сэрц*а* і г. д.

*) Гэта відаць зьмяніўшы слова: мё*д*у, кало*д*а, па*д*ыйсьці, мые*ш*.

На *а* замяняецца і кожнае *э* ў цьвёрдым складзе (пасьля цьвёрд. гал.): р*а*ка, ц*а*на, пераме́на, каж*а*ш (хоць пад націскам — э: рэкі, цэны, кажэце).

У *мягкіх* складох *перад* націскам *е* замяняецца на *а* (*я*) не заўсёды.

У трэцім, чацьве́ртым і дале́йшых складох (лічачы ад націску да пачатку слова) *е* не замяняецца ніколі на *а* (*я*): верацяно, без верацяна; не выпускай і г. д.

У другім складзе — толькі тады *е* замяняецца на *а* (*я*), калі ўпе́ршым няма *а*: лясуна́, бядуна́, нявучо́ны, ня была́, бяз дзіцяці і г. д. Калі-ж у пе́ршым складзе ёсьць *а* (*я*), то ў другім пішацца *е*: цецярук, лесавік, не знайшла, не магу, не хачу, без мяне і г. д.

У пе́ршым складзе заўсёды бывае *а* (*я*): бяда, дзяжа, вяду, зялёны, няма, няхай, ня буду, бяз нас, бяз духу і г. д.

Увага. 1. Не і без у гэтым разе лічацца за склад таго слова, перад якім яны стаяць.

2. Склады тут лічацца ад націску да пачатку слова такім парадкам: ля(2)-су(1)-на́ (су — пе́ршы склад, ля — другі). Так сама: без(4) ве(3)-ра(2)-ця(1)-на́ і г. д.

У мягкіх складох *пасьля* націску пішацца *е*: вос*е*нь, воз*е*ра, ве́ц*е*р, вучыц*е*ль, у хац*е*, у садз*е*, пол*е*, ле́ц*е*йка, сіня*е* (не́ба), сін*е*нькі, то*е*, дума*е*ш, будз*е* і г. д.

З гэтага правіла выключаюцца такія разы, як:

1) памяць, ме́сяц, дзе́вяць, дзе́сяць, дзе *а* ў аснове, або дзе́ *а* канчатак іме́ньняў жан. р. (гаспадыня, паня, як зямля), або дзе́ *а* з *о*: дзе́дзя*) (з дзе́дзё) і інш.

2) формы роднага скл. адз. л. мужч. і ніяк. р. на *а*: вучыцеля, вучня, поля, зе́льля і г. д.

3) формы родн. скл. мн. л. ўсіх трох радоў на — *аў*: прыяцеляў, зе́мляў, гоняў і г. д.

4) формы дав., твор. і ме́с. склону мн. л. ўсіх трох радоў на — *ам*, *амі*, *ах*: вучням, зе́млям, здарэньням, прыяцелямі, зе́млямі, здарэньнямі, прыяцелях, зе́млях, здарэньнях.

5) формы прыме́таў назоўнага склону адз. л. жаноц. і ніякага роду: сіняя вада, добрая галава, сіня*е* мора і г. д.

6) формы родн. і давал. скл. прыме́таў мужч. і ніяк. роду: сіня*га*, сіняму і інш. (як яго, яму).

7) родны склон прыме́ты жаноцкага роду: сіня*е* вады, добрае кніжкі і г. д; (як яе́, тае́).

8) назоўн. і вінав. склон прыме́ты мн. л. ўсіх трох радоў: добрыя, зялёныя, чырвоныя, каме́нныя і г. д.

9) формы 3 ас. мн. л. дзеясловаў 2 спраж.: ходзяць, носяць, водзяць і г. д.; так сама дзеяслоўная прыме́та і прыслоўе: ходзячы, водзячы, носячы і г. д. (бо яны выводзяцца ад 3 ас. мн. л.: ходзяць, носяць, водзяць).

10) займе́ньне — ся: робішся, гонішся і г. д.

Калі *е* пад націскам, то на ім трэба ставіць знак націску: хле́б, не́ба і г. д.**).

---

*) але ў такіх старых формах, як вароцех, боцех, пішацца *е*.

**) такія словы, як *перад*, *цераз*, *але*, *без*, *дзеля*, свайго націску ня маюць, становячы быццам часьць таго слова, перад якім яны стаяць, дзеля гэтага над імі ня ставіцца знак націску: перад на́мі, цераз хату, але так не́льга, бяз нас, дзеля таго і г. д. Калі-ж *але* азначае пацьвярджэньне, то яно мае націск: ці ў цябе́ мая кніжка? — але́.

Такім парадкам, літара *é* азначае выразны націснуты галосны, так сама як *о:* камéньне, голад.

Літара *е* азначае ненаціснуты гук або шырэйшы за *é* (бліжэй да а), або вузéйшы за *é* (бліжэй да і): у садзе, сіненькі.

Не, без, перад, пера і інш. падпадаюць пад агульнае правіла аб аканьні: няшчасьце, няволя, бяздомны, бязрадны, непачэсны, безгалосы, перадплата, перавоз і г. д. Так сама калі *не, без, перад, цераз* стаяць перад другім словам, але пішуцца асобна: ня дам, ня вéдаю, бяз хлéба, бяз нас, перад ім, не давéдаўся, без гаворкі і г. д.

Задачка. Перапішы і замéста крыжыка пастаў *а* (*я*) або *э* (*е*):

Н× прывéтна цер×з вокны ночка п×зіра×. Ціх× ў хац× — ўся сямéйка сьпіць ды спачыва×, натрудзіўшы добр× рукі, нат×міўшы плéчы. Толькі матка з в×р×цéнц×м прытулілась к пéчы і прадзé, прадзé кудзéльку. Скач× в×рацéнц×, а за ёй густы× цéні бéгаюць па сьцéнцы. На камінку корч пыла×, злот×м іскры скачуць. За ваконц×м вéц×р ходзіць, глух× вéрбы плачуць. Зябнуць вéрбы на мароз×, прытуліўшысь к стрэс×; сьнéгам вéц×р сып× ў дзьвéры, ходзіць шум па лéс×. І пад гэты шум трывожны дума× стара×, а ў сьлéд думкам н×спакойна вец×р падп×ва×.

Вучыс× н×бож×, вучэньн× памож× змагацца з н×дол×й, з н×вол×й... Што мучыць с×гоньня, што думкі трывож×, —зьбяжыць і н× прыйдз× ніколі.

Жаль згін×, як мара; н× будз×ш н×здарай, нідзé і ні ў чым н× заблудзіш; ты праўду ў н×праўдзе, як сонц× між хмар×ў, спазна×ш, як цём×н н× будз×ш.

Така× прынука, як праца й навука, ці-ж мож× нам сіл не дадаці? З такімі с×брамі, знай, будз× н× штука і гор× сваё зваяваці.

Навука даé ч×лавéку розум. Чужым розумам вéк н× п×р×жывéш. В×ўка ногі кормяць.

§ 95. У *чыслах* аканьне правéдзена ня поўна. Чыслы складаныя пішуцца так, як кожная часць, калі яна ўжываецца асобна: семнаццаць, восемнаццаць, шэсьцьсот, восемсот і інш. Толькі шаснаццаць мае *а* замéста *э*, што чуваць у слове шэсьць. Парадкавыя маюць такі галосны, які ў лічным: дзéвяць—дзевяты; дзéсяць - дзесяты і г. д.

§ 96. *Галосныя ў канчатку дзеясловаў 1-га і 2-га спраж.* Калі націск прыходзіцца на канчатак, то галосныя, будучы пад націскам, чуваць ясна і заўсёды аднолькава.

1 спраж. Няс-у, няс-éш, няс-é(ць), няс-ём, няс-іцё, няс-уць; бяр-у, бяр-эш, бяр-э, бяр-ом, бяр-ыцё, бяр-уць.

2 спраж. Сядж-у, сядз-іш, сядз-іць, сядз-ім, сядз-іцё, сядз-яць; маўч-у, маўч-ыш, маўч-ыць, маўч-ым, маўч-ыцё, маўч-аць.

Тутака трэба заўважыць толькі тое, што, калі націск на канцы, то ў 2 асобе мн. л дзеясловы абодвух спражэньняў маюць у канчатку *і, ы:* нясіцё, бярыцё, так сама, як сядзіцё, гарыцё.

Калі-ж націск не на канцы, то ў пéршым спраж. маем *е* (пасьля цьвёрдых *а*), у другім *і* або *ы:* думаеце, кажаце; носіце, гаворыце і г. д.

Калі націск прыходзіцца на канчатак, то адразу відаць, якое спражэньне: ідзéш, сядзіш, гарэш, маўчыш і г. д. Тутака ясна, што пісаць.

Але калі націск ня прыходзіцца на канчатак, то тады трэба глядзéць, што стаіць у канчатку неазначальнае формы. Калі стаіць *і* або *ы*, то гэта

дзеяслоў 2-га спраж.*), і ўсюды трэба пісаць *і*, *ы*, а ў 3 ас. мн. л. *а*: мал*і*ць — моліш, моліць, молім, моліце, моляць; вар*ы*ць, — варыш, ва́рыць, ва́рым, ва́рыце, варaць. У праціўным разе, гэта дзеяслоў 1-га спраж. і ўсюды трэба пісаць *е* (у цьвёрдым складзе *а*), а ў 3 ас. мн. ліку *уць*: ве́д*а*ць—ве́даеш, ве́дае, ве́даем, ве́даеце, ве́даюць; каз*а*ць — кажаш, кажа, кажам, кажаце, кажуць.

Дзеяслоўныя приме́ты і прыслоўі выводзяцца ад 3 асобы мн. л., дзеля чаго ў пе́ршым спраж. канчаюцца на—*учы*,—*ючы*, у другім на—*ачы*, — *ячы*: яны кажуць, мыюць—кажучы, мыючы, яны гавораць, стаяць — гаворачы, стоячы.

Аб формах загаднага ладу бач вышэй § 76.

Увага. Калі націск на канчатку, то ў дзеясловах 2-га спр. ў форме 1-ае асобы мн. ліку побач з формамі на *ім*, *ым* могуць ужывацца формы на *ём*, *ом*, як у 1-ым спраж.: стаім, сядзім, маўчым, крычым і стаём, сядзём, маўчом, крычом і г. д.

Задачка. Перапішы і замяні крыжыкі літарамі:

Карагоды зорак у гары мігаXць, а ў нізе сьняжынкі срэбрам адліваXць. Маці свайго сына це́шыць, забаўляX. Ты мне́ раскажXш, як будзXце робіць. Касцы пяялі апранаXчыся на пракосах. Цярпе́ньнем і працай горы пераносXць. ПадзярXце рызьзё на стужкі і сатчэце рызоўку. РасчынXце цзьве́ры. Разьве́йся туман, расплывXцеся хмары! Жалем сьціскаXцца грудзі. На Саракі мужык пытаXцца ці далёка да ракі. Калі не нае́ўся, то й не наліжXшся. І сава свае́ дзе́ці хвалXць. Кінь прад сабой, знойдзXш за сабой. Цыган, як гале́X, то сьмяле́X. Голад і холад мучXць людзе́й. Калі маXш гаруд жыта — будуйся. Новае сіта на калку вісіць, а старое пад лаўкай наваляXцца.

---

*) Але ў такіх, як кры-ць, мы-ць, вы-ць, шы-ць, ры-ць, *ы* адносіцца да караня: гэтыя дзеясловы 1-га спраж. — крыеш, крые, крыем, крыеце, крыюць, мыеш, мые, мыем, мыеце, мыюць і г. д.

§ 97. *Звонкія зычныя* на канцы слова і перад глухім страцілі сваю звонкасьць. Але хоць і чуваць боп, лёт, лотка, дзяцька, мох, лёхка, дошч і г. д., аднолька-ж пішам боб, лёд, лодка, дзядзька, мог, лёгка, дождж і г. д. (бо ў другіх разох, зьмяніўшы слова так, каб пасьля яго стаяў галосны, знойдзем бобу, лёду, лодачка, дзядзіна, магу, лёгенькі, дажджу і г. д.

Так сама трэба пісаць і прыйме́ньні **ад**, **пад**, **над**, **прад**, **перад** незале́жна ад таго ці яны пішуцца разам з якім словам ці асобна: ад хаты, адхінуць, пад сонцам, падцягнуць, над хатай, надхадзіць, пад сталом, прадстаўнік і г. д.

Усе́ прыйме́ньні, што канчаюцца на *з* — **з**, **без**, **уз**, **раз**, — калі яны пішуцца з якім словам разам, то перад глухім зычным (п, т, ц, ч, х, с, ш) замяняюць *з* на *с*, а перад звонкім пакідаюць *з*: сxадзіць, усхадзіць, расьпіць, але — згінуць, бяздомны, узгадаваць, разьбіць і г. д. Значыцца тутака трэба пісаць, як чуваць.

Але калі **з** і **без** пішуцца асобна, то ніколі *з* на *с* не замяняецца: з хаты, бяз хле́ба і г. д. Так сама пішацца і **цераз**: цераз ток.

Задачка. Перапішы і заме́ста крыжыка пастаў літару.

У гародзе расьце́ боX. ЦэX вісіць у гумне́. У Адама́ высокі лоX. ЛоX яго лаXкай пя плячох. Поўная луXка збожжэ. Хле́X на стале́, рукі свае́. Важыш на рыXку, важ і на юшку. Не адарві почаXкі ад калыскі.

Іду па клаXцы. МёX салоXкі. Сабака зьнюхаў сьле́X. AXклаX ня йдзе́ ў лаX. Ты браX мой, е́ш хле́б свой. Гэта кве́Xка не для твайго носу. І я быў каліcь молаX. У каваля цяжкі молаX. Уле́Xку люблю цябе́, дзе́тку, а зімой зье́м хле́б з свіньнёй.

Сёлета гаро× стручны. Адзін наро× прытупіўся. У медзьвядзя ёсьць бярло×. Для цяляці адгароджаны кату×. Пасту× сьцяро× авéчкі. Мнé лё×ка на сэрцы. Ен éдзе ўлé×цы. Начлéжнікі паéхалі на начлé×. Якая дра×кая дарога. Ты мо× дзéрці мо×.

У Слуцку ўсё палю×ку. А×дай сваё грама×кай справе. Слу×кія паясы вéльмі харошыя. Тутака былі ваяво×кія палацы. Пола×кія князі — беларускія. Навагра×кі і Ашмянскі павéты—сумéжныя між сабой. Ксён× паéхаў да хворага. Купé× купіў лён.

Лé× падняў гэты камень. У восень капаюць рэ×ку. Хвалько нахваліцца, а бу×ка набудзецца. Ба×кі гадуюць дзяцéй. Мé× дастаюць з зямлі. Не ва×цеся, людзі, бо ўсім блага будзе.

На страсé мох выра×, на моху бяро×ка, мілéй свая хатка, як чужая вё×ка. Бéгала лі×ка каля лéсу блі×ка. Ба буля ўмéе ра×кáзаваць цікаўныя ка×кі. Вось улé× у густы лé×! Пола× прымéрз да сьнегу. Бэ× пахне. Кожны бé× цягне ў лé×. Злé× з таго дрэва. Гу× крычыць на двары. У драбіне зламалася во×.

Каб ня é×ка, не адзé×ка, дык была-бы грошай дзé×ка. Праз Беларусь сту×кай ліéцца рака Нёман. Жнéйка ця×ка працуе. Пту×ка зачапілася но×кай за волас сіла. Ля дарогі стаіць кры×. У краме прадавалі ры×. Пашла гуляць качарэ×ка. Котка злавіла мы×ку. Калі ўзяўся за гу× не кажы, што ня ду×.

На× хатай лётае каршун. Пера× імі пакланіся. Сноп а× снапа на дзьвé стапы. Жораў × цяплом, ластаўка × лістом. Па× табой каня забілі. Ра×мяні мнé грошы. Ра×капай яму. Зоркі ра×сыпаліся на нéбе. Бацька ў×хапіўся, абуў боты і, ра×чыніўшы дзьвéры, выйшаў на панадворак. Бе× дабра ня будзе дабра. Бя× часу ня будзе квасу.

§ 98. Глухія зычныя перад звонкімі чуваць, як звонкія: ка*зь*ба, про*зь*ба, гарад*зь*ба, пяд*зь*дзесят і г. д. Тутака пішам ня так, як чуваць: ка*сь*ба, про*сь*ба, пя*ць*дзесят (за тое, што маем касіць, прасіць, пяць).

Задачка. Гарба, мала×ба і ка×ба—цяжкія работы. Наш дзéд ужо слабы ў ха×бе. Прасі Бога, каб про×ба дайшла

да нéба. Дзядуля сядзіць на пры×бе. Ка×біт косіць сéна. Мала×біты пашлі дамоў. У капé ша×дзесят адзінак. Майму бацьку пя×дзесят ша× гадоў.

§ 99. *Перад мягкімі зычнымі і ь* **з, с, ц, дз,** зьмягчаюцца: зьняць, сьляза, цьвіцéць, дзьвé, зьéхаць і г. д. Толькі перад *г, х, к* яны не зьмяняюцца.

Задачка. Перапішы і замéста крыжыка пастаў з, с, ц, дз або зь, сь, ць, дзь:

Купéц зарабіў ×вéсьце рублёў. Маці ×хінулася над дзіцянём. ×віршня штось папсавалася. ×кінь гэтае рызьзё. У прочкі ×бірайся, а жыта сéй. Пустой птушкі пустыя і пéсьні. Вучань прачытаў ×вé кнігі. Ні сьцяты, ні павéшаны. У зімку ×вéры хаваюцца ў норы. ×ліна бывае зара×лівая. Ня рыпайце ×вярыма. Шкло якоесь ×мяннае. Яблыны ×вітуць бéлым ×вéтам.

§ 100. Злучэньні **тц, чц** чуваць як **цц**, а злучэньні **тч, дч,** як **чч** —

чуваць:	**пішацца:**
маццы	матцы
даццы	дачцы
загаччык	загадчык

і г. д.

Злучэньне **дс** дае ў вымове **ц**, хоць пішацца дз —

чуваць:	**пішацца:**	замéста:
люцкі	людзкі	людскі
швэцкі	швэдзкі	швэдскі

і г. д.

Злучэньне **тс** дае́ **ц** —

чуваць і **пішацца**:	заме́ста:
полацкі	полатскі
брацкі	братскі
брацтва	братсва

і г. д.

Злучэньні **жс**, **зс** даюць **с** —

чуваць і **пішацца**:	заме́ста:
боскі	божскі
францускі	французскі

і г. д.

У злучэньнях **стл** і **здн** зьнікае **т** і **д**.

чуваць і **пішацца**:	заме́ста:
пачэсны	пачэстны
позны	поздны
шчасны	шчастны
шаснаццаць	шастнаццаць

і г. д.

Злучэньне **нн** ужываецца ў тых прыме́тах, што створаны ад іме́ньня, якое мае *н* у аснове: сьцяна—сьце́нны, камень—каме́нны, вайна—вае́нны, палатно—палаце́нны і г. д. Але там, дзе́ ў аснове няма *н*, пішацца адно *н*: шкло—шкляны, дрэва — драўляны, гэтак сама зроблены, пабе́лены і г. д.

Злучэньне **цц** ўжываецца ў чыслах і дзеяслове: адзінаццаць, дванаццаць і г. д.; мыцца, сьмяяцца, ён мыецца, сьмяе́цца і г. д.

§ 101. *Галосныя* **у** і **і** дзеля складнасьці замяняюцца на *ў* і *й*, калі папярэдняе слова канчаецца галосным: было ў бацькі тры сыны, яна ўжо пайшла; ён яго *й* поіць і корміць, яна *й*дзе́ і г. д. Але пасьля зычнага *у* і *і* не замяняюцца на *ў* і *й*: я тут *у*жо даўно, ён *у* хаце; ён *і*дзе сюды, брат *і* сястра і г. д.

Ад гэтага правіла дзеля ве́рша дужа часта адступаюць:

Чыстых хмарак валаконцы
Сталі *у* кружочак
Вышай ле́су, проці сонца
І сплялі вяночак.

§ 102. *Прыйме́ньні з прыслоўямі* пішуцца разам: *у*пе́рад, *на*зад, *на*сустрэчу, *да*гары, *з*раньня, *за*праўды, *на*адзіноцы, *у*ле́тку, *у*зімку, *у*раньні, *у*ве́чары, *па*асобку, *у*ваччу, *па*беларуску, *па*чэску, *по*тым, *за*гадзя, *на*ўмысьля, *с*пакваля, *за*ўсе́ды, *ад*куль, *да*сюль і г. д.

Так сама разам з прыслоўямі пішуцца **не**, **ні** і ўсе́ складаныя прыслоўі: ніколі, нідзе́, не́калісь, няма,; абе́руч, абыдзе́, абыяк, ажно і г. д

§ 103. **Злучок** ужываецца ў гэткіх разох:

1) для злучэньня частак **бы**, **б**, **жа**, **ж** з папярэднім словам: добра было-бы, каму-б гэта даць, а мой-жа ты суседзька! ды куды-ж ты, дуб зялёны, пахінаешся?

Увага. Калі-ж *бы*, *б* і *жа*, *ж* сходзяцца разам, то яны паміж сабой злучком ня злучаюцца: калі-ж бы мне́ пайсьці, вось быў-бы ж ты рады і г. д.

2) для злучэньня складаных прыймéньняў *з-за*, *з-пад*—з-за стала, з-пад лому і г. д.

3) для злучэньня двух словаў, што азначаюць тую самую рэч — узьвéй-вéцер, вéцер-дуронік.

4) у падвойных фаміліях—Дуж-Душэўскі, Сьвятаполк-Мірскі, Дунін-Марцінкéвіч і г. д.

5) у складаных прымéтах — сьнéжна-бéлы, цёмна-сіні і г. д.

§ 104. *Словы чужазéмныя*, узятыя з чужое мовы даўно, пішуцца так, як гэта чуваць у штодзéнным ужытку: літара, аканом, арганісты, паляруш, калідор, леварвэр, камісія і г. д.

Словы чужазéмныя, што ўжываюцца ў кніжках і ў кніжнай мове і да народу не дайшлі або дайшлі нядаўна, пішуцца так, як у тэй мове, скуль яны ўзятыя: тэлеграф, тэлеграма, літэратура, монолёг, тэатр, дынастыя, партыя, рэдакцыя, інспэктар, дырэктар, рэдактар*) і г. д.

Замéста падвойных зычных пішуцца простыя: каса, маса, тэлеграма, Фінляндыя, Голяндыя—а ня касса, масса, тэлеграмма, Гольляндыя, Фінняндыя і г. д.

Чужазéмнае l, перадаéцца мягкім *ль*, а ня цьвёрдым *л*: Лёндон, філёзофія, монолёг і г. д.

Трэба заўважыць правапіс у такіх разох, як рэдакцыя, нацыя, Францыя, рацыя; рэдакцыйны, нацыянальны, рацыянальны, Голяндыя, Фінляндыя, Курляндыя.

---

*) у такіх разох ар замéста ор пад уплывам беларускіх слоў на — ар: пісар, знахар і г. д

V.

С к а з

§ 105. У мове кожнае слова ўжываецца не асобна, а ў зьвязку з другімі. Як вяжуцца паміж сабою словы ў мове паказвае навука аб сказе.

У мове мы выказваем словамі розныя думкі. **Думка выказаная словамі называецца сказам:** *Пастух трубіць. Зоркі зігацяць на нéбе.* Словы, з якіх складаецца сказ, называюцца **часьцінамі сказу**.

Часьціны сказу дзéляцца на **асноўныя і даданыя**.

Асноўныя часьціны дзьве: **дзéйнік і сказьнік**.

Дзéйнік паказвае асобу або рэч, якая нéшта *дзéіць* або з якою нéшта дзéіцца: *пастух* трубіць; *зоркі* зігацяць.

Увага. Вéльмі важна заўважыць тое, што дзéйнік стаіць у назоўным склоне (адказвае на пытаньне— *хто? што?*): *пастух* трубіць, *трава* расьцé, *яны* прыйшлі, *пяць* больш за чатыры і г. д.

Сказьнік паказвае, *што* ў сказе *кажацца* аб дзéйніку, або што дзéйнік дзéіць ці што з ім дзéіцца: пастух *трубіць*, зоркі *зігацяць*, трава *зялёная* і г. д.

§ 106. Даданыя ча́сьціны сказу дадаюцца або да дзе́йніка, або да сказу. Возьмем. напр., такі сказ: *Цікаўныя кніжкі ляжаць на паліцы.* Тутака *кніжкі*—дзе́йнік, *ляжаць*—сказьнік; слова *цікаўныя* адносіцца да дзе́йніка (на пытаньне *якія* кніжкі? — цікаўныя); слова *на паліцы**) адносіцца да сказу (на пытаньне *дзе́* ляжаць? — на паліцы).

Да даданых часьцінаў мовы могуць дадавацца другія даданыя часьціны. Вось, напр., сказ: *Краве́ц пашыў до́брую сьвітку.*

Краве́ц пашыў—гэта асноўныя часьціны (дзе́йнік і сказьнік). *Што* пашыў?—пашыў *сьвітку*: гэта значыць, *сьвітку* адносіцца да *пашыў; якую* сьвітку?—*добрую*: значыць *добрую* адносіцца да *сьвітку*, да даданае часьціны.

Тая часьціна сказу, што адказвае на пытаньні *які?, чый?, каторы?, колькі?* называецца **азначэньнем**.

Ен мае **добрую** (якую ?) *кніжку.*
Сын любіць **свайго** (чыйго?) *бацьку.*
Паляўнічы забіў **чацьве́ртага** (каторага?) *цецярука.*
Я маю **пяць** (колькі?) *братоў.*

Калі-ж слова адказвае на пытаньні *каго? чаго? каму? чаму? каго? што? кім? чым? пры кім? пры чым?*, то яно называецца **дапаўне́ньнем**.

Напрыклад: *Вазьмі брытву* **ад дзіцяці** (ад каго?). Ня люблю я **ме́ста** (чаго?) і г. д.

Увага. Дапаўне́ньне, што стаіць у вінавальным склоне (*каго? што?*), называецца простым, усе́ іншыя называюцца *ускоснымі.*

Тыя словы, што азначаюць час, ме́йсца, прычыну, мэту або спосаб дзе́йнасьці, называюцца

*) прыйме́ньне ў сказе ня лічыцца за асобную часьціну.

акалічнасьцямі часу, ме́йсца, прычыны і спосабу.

Акалічнасьць часу адказвае на пытаньні *калі? ці доўга? ад якога і да якога часу?* Напрыклад: *Вечаром* пайшоў дождж. *Усьцяж* па табе́ плачу. Працуй *зраньня аж да зьмярканьня.*

Акалічнасьць ме́йсца адказвае на пытаньні *дзе? скуль? куды?* Напрыклад: *Бяда ў* **бары** *яго спаткала.* **З не́ба** *звалілася зорка. Рэкі плывуць* **у мора**.

Акалічнасьць прычыны адказвае на пытаньне *чаму? дзеля якое прычыны?* Напрыклад: *Ен* **за работай** *ня будзе ме́ць часу й паме́рці. Ен вярнуўся дамоў* **дзеля бацькоў**. *Хата загарэлася* **ад печы**.

Акалічнасьць мэты адказвае на пытаньні *нашто? для якое мэты?* Напрыклад: *Ен шмат дае́* **на бе́дных**. *Валы пайшлі ваду* **піць**.

Акалічнасьць спосабу паказвае *як, якім спосабам* не́шта робіцца. Напрыклад: **Ціха** *сьпіць дзіцятка. Пайшла ў ме́ста* **пехатою**.

§ 107. Тыя сказы, што маюць толькі асноўныя часьціны, г. з., дзе́йнік і сказьнік, называюцца **кароткімі**: *Сонца ўзыйшло. Бацька гарэ.*

Тыя, што маюць апрача асноўных часьцін і даданыя, называюцца **разьвітымі**: *Побач раскінулісь родныя ве́скі. Жалем сьціскаюцца грудзі.*

Сказы, што маюць дзе́йнік, называюцца **поўнымі**. *У паноў было ігрышча. Усё сьпіць.*

Тыя сказы, што дзе́йніка ня маюць, але ён разуме́ецца, аб ім можна дагадацца, называюцца **няпоўнымі**: *У аднаго чалаве́ка былі два сыны. Жылі сабе́ згодна* (разуме́ецца сыны).

Калі-ж аб дзе́йніку і дагадацца не́льга, то гэта **безасабовы** сказ (г. з., без асобы або рэчы, ад якое зале́жыць дзе́йнасьць). *Сьцямне́ла. Грыміць. Чужым*

розумам век не паражывеш. Хоць блізка відаць, ды далёка дыбаць. Цярпеньнем і працай горы пераносяць.

Калі ў сказе два ці больш дзейнікі, сказьнікі, дапаўненьні, азначэньні ці аднолькавыя акалічнасьці, то такі сказ называецца **зьлітым**. Напрыклад: *Ідзе* жняя *і* весела *пяе. Весела й хутка* мінутка ў мінутку зойдзе нам час. *У стуку і груку* забудзем мы муку працы сваé.

§ 108. Кожную часьціну сказу можна разьвіць у цэлы **сказ даданы**, які дадаецца да **сказу асноўнага**. Заместа—ніхто ня ведае *чужога абеду*, можам сказаць: ніхто ня ведае, *як хто абедае*. Ніхто ня ведае — гэта сказ асноўны; *як хто абедае* — гэта даданы сказ дапаўненьня, бо ён замяняе дапаўненьне (чужога *абеду*).

Так сама, як сказ дапаўненьня, могуць быць даданыя **сказы дзейніка, азначэньня і розных акалічнасьцей**, калі яны замяняюць дзейнік, азначэньне і акалічнасьці. Напр.: І той багатыр, *хто мае ўсялякага дабра*, і той, *хто дужы і здаровы.* Гай, *што быў цёмны*, зазеляніўся. Ніхто ня дойдзе туды, *дзе канчаецца зямля*. Тады папараць зацьвіціць, *калі на вярбе вырастуць грушы*. Будзе голад, *бо збожжа не ўрадзіла*. Прыйшлі да хаты, *каб супачыць*. *Як ты да людзей*, так людзі да цябе.

Увага. Сказы даданыя інакш называюцца **залежнымі**, бо яны залежаць ад асноўнага сказу. Тады сказ асноўны называецца **незалежным**.

§ 109. Прыдатак—гэта ёсьць азначэньне, выказанае іменьнем; стаіць яно ў тым самым склоне, як і тое слова, да якога яно адносіцца. Напрыклад:

Астаўся адзін сын, **сірата**. *Ех ты, Нёман,* **рака**. *Янка,* **брат майго таварыша**, *вельмі любіць паляваньне.*

Прыдатак з усімі тымі словамі, што да яго адносяцца, выдзяляецца коскамі.

Зваротак так сама выдзяляецца коскамі. *Радзі,* **Божа**, *жыта!* Сьпі, наш міленькі саколік! Брацьця, ці зможам грамадзкае гора?

§ 110. У пісанай мове ставяцца розныя **знакі прыпынку**.

Пункт (.) ставіцца пасьля кожнага закончанага сказу.

Коска (,) выдзяляе зваротак, прыдатак, даданыя сказы з асноўнага і разьдзяляе падобныя часьціны ў зьлітым сказе. Напрыклад: *Лятуць да нас, лятуць яны з далёкай, цёплай стараны, нясецца крык іх над зямлёй, бо бачуць ўжо край родны свой.*

Коска звычайна стаіць перад *а, бо, але, калі, дзе, які, каторы, хто, што, хоць* і ў іншых разох.

Коска разьдзяляе так сама і незалежныя сказы, калі яны дужа кароткія, альбо паміж імі стаіць *і, а, але*. *Лета зьбірае,* **а** *зіма праядае. Загрымеў гром,* **і** *пайшоў дождж. Смачны жабе гарэх,* **але** *зубоў Бог ня даў.*

Калі-ж незалежныя сказы нічым ня зьвязаны і ня зусім кароткія, то паміж імі ставіцца **пункт з коскай** (;). Напрыклад: *Вясною косы сонца што дзень робяцца цяплейшымі. Птушкі пяюць зычней і весялей; перайка на іх асьвяжаецца, і самі яны ажыўляюцца.*

Два пункты (:) ставяцца:

1) перад пералічэньнем, калі ёсьць слова, што абыймае ўсё пералічанае, напрыклад: *Год мае чатыры* **пары**: *вясну, лета, восень, зіму.*

2) паміж незалёжнымі сказамі, калі адзін аб'ясьняе другі—*Тут ня гандаль, тут ня крама: няма дзёгцю, няма солі.* Наагул, *два пункты* блізка тое самае, што слова *значыць*.

Працяжнік (—) ставіцца пасьля пералічэньня, дзé прапушчана нéйкае слова і, наагул, там, дзé хочам *працягнуць* увагу чытара, напрыклад: *вясна, лéта, восень і зіма — пары году. Падсадзі — сарву я грушку.*

Недаказ (...) ставіцца, калі думка не даказана, напр.: *Сказаў-бы я табé... але што там гаварыць.*

Пытальнік (?) стаіць пасьля пытаньня. *Дзé-ж ты гэта, мой каласок?*

Клічнік (!) стаіць пасьля клічу, напр.: *Добры вéчар, пане гаспадáру!* Адважна, брацьця!

У **чужаслове** „—" ставяцца або чужыя словы (ня тэй асобы, што гаворыць ці расказвае), або словы нéчым асаблівыя, напр.: *Узяў шапку і, сказаўшы: „Аставайцеся здаровыя"! выйшаў з хаты. „Наша Доля" — пéршая беларуская газэта.*

У **скобкі** бярэцца паясьнéньне або пабочная думка: Беларускія пляменьні (крывічы, дрыгвічы і радзімічы) здаўна жывуць на сваёй зямлі.